КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 48 (1644) | 8 снежня 2023 г.

Светлая прэм'ера

Узнёслы гімн мудрасці на фоне агульнай радасці. Рэжысёр Данііл Філіповіч прэзентаваў спектакль "Двор майго дзяцінства". Настальгічны праект рэалізаваны ў Купалаўскім тэатры за кошт гранта Прэзідэнта Беларусі.

Працяг тэмы на стар. 7

Сцэна з пастаноўкі. Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

9 771994 478007 23048

KULTURA-INFO.BY

Фота: president.gov.by

У імя захавання жыцця на Зямлі

Чаму сёння няма міру на планеце і дзе ўзяць грошы на зялёны парадак дня? На пытанні адказаў Прэзідэнт Беларусі падчас Сусветнага саміту па барацьбе са змяненнем клімату. Кіраўніку нашай дзяржавы апладзіравалі стоячы.

Саміт праходзіў у Дубаі, куды прыехалі прадстаўнічыя дэлегацыі з больш як 150 краін. Удзельнікамі пленарнага пасяджэння былі амаль 90 першых асоб. Аляксандр Лукашэнка агучыў падыходы і прапановы Беларусі па вырашэнні глабальных пытанняў кліматычнай і экалагічнай бяспекі.

— Сёння мы, лідары дзяржаў свету, гаворым пра будучыню планеты Зямля — нашага агульнага дому. Іншага дому ў нас не было і не будзе. Гаворым пра будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў. Пра будучыню ўсіх, хто прыйдзе ў гэты свет пасля нас, — звярнуўся да прысутных Прэзідэнт Беларусі. — Мы прадстаўляем розныя культуры, розныя сістэмы каштоўнасцей, розныя цывілізацыі. Але мы адзіныя перад тварам глабальнага выклику, які кінула нам сама прырода.

Па словах Кіраўніка дзяржавы, клімат мяняецца — навукоўцы робяць самыя змрочныя прагнозы. Але каб процістаяць пагрозе, неабходна выявіць яе першапрычыны. Сярод галоўных Аляксандр Лукашэнка назваў адсутнасць пачуцця меры ў імкненні да геапалітычнай перавагі тых, хто распальвае канфлікты ў розных кутках планеты:

— А войны з'яўляюцца галоўнай крыніцай бруду на нашым кантыненце. Гэта прага нажывы, якая ператварае прыродныя рэсурсы ў асабісты капітал і абкрадае будучыня пакаленні.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў адпаведнасці з Парыжскім пагадненнем Беларусь у поўнай меры выконвае і нават перавыконвае свае абавязацельствы:

— Мы аказваем бясспэнныя экасістэмныя паслугі нашаму кантыненту, захоўваючы ўнікальную крыніцу кіслароду — прыродныя балоты, лясы, лёгкія Еўропы. Развіваем зялёную і атамную энергетыку, мінімізуючы рызыкі змянення клімату.

Але, як заўважыў беларускі лідар, у адказ атрымліваем эканамічныя санкцыі, бар'еры ў міжнародным гандлі, абмежаванне доступу да тэхналогій. Прэзідэнт лічыць: нельга душыць палітычных апанентаў санкцыямі і ў той жа час патрабаваць затратных для нацыянальных эканомік мер, ад якіх залежыць чысціня атмасферы, грунтавых вод і сусветнага акіяна. Аляксандр Лукашэнка заклікаў уносіць суразмерны ўклад у вырашэнне пытанняў кліматычнай бяспекі, узмацніць падтрымку краін, што развіваюцца, і перастаць выказваць “заклапочанасць”, а пачаць ужо дзейнічаць у імя захавання жыцця на Зямлі.

— У нас няма маральнага права жыць толькі для сябе. Мы павінны заглядваць за гарызонт, паважаць законы прыроды і стварыць аснову для прадаўжэння чалавечага роду тут і цяпер, — заўважыў Кіраўнік нашай дзяржавы. А ў адказ на пытанне, дзе ўзяць грошы на зялёны парадак дня, прапанаваў згадаць нядаўнюю гісторыю — войны ў Іраку, Афганістане, сённяшнія бойні ва Украіне, на Блізкім Усходзе, сітуацыю ў Ціхім акіяне:

— Гэта трыльёны, трыльёны долараў. Дык давайце іх накіруем на чысціню планеты.

Прэзідэнт падкрэсліў, што 80 % бруду на Зямлі — ад 20 вядучых дзяржаў, і прапанаваў запатрабаваць ад іх скараціць хаця б напалову выкіды ў атмасферу.

— Вось яны — грошы, жывыя грошы. 10 трыльёнаў долараў, якія мы можам, спыніўшы войны, накіраваць на ачышчэнне нашай планеты, — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка. — І давайце дзейнічаць. Не пачнём дзейнічаць — прырода прымусіць нас жыць па яе законах.

На парадку дня — культурнае імпартазамяшчэнне

Як ствараць, прапагандаваць і ўкараняць сваё? Пытанні культурнага імпартазамяшчэння абмеркавалі 5 снежня на пасяджэнні Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы ў Мінску.

Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы створаны па распараджэнні Кіраўніка дзяржавы і дзейнічае пры Адміністрацыі Прэзідэнта з 2022 года. Міжведамасны орган з першых дзён меў на мэце ўдасканаленне гістарычнай адукацыі. Гэтае пытанне было ўключана ў парадак дня і цяперашняга пасяджэння.

Падсумоўваючы работу савета за год, Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар Сергеенка адзначыў, што ўдалося зрушыць з месца тэму выкладання гісторыі Беларусі ў ВНУ і палепшыць школьную гістарычную адукацыю. У аснове працы не толькі асвета, але і выхаванне патрыётаў. Пабудавана цэлая сістэма. Былі арганізаваны на больш высокім узроўні навуковыя канферэнцыі па пытаннях захавання гістарычнай памяці, наладжана цеснае ўзаемадзеянне з расійскімі калегамі.

Таксама разглядаліся пытанні выдавецкай справы. Абмяркоўвалася выключэнне з продажу матэрыялаў, якія скажаюць гістарычную праўду, і алгарытм канфіскацыі з бібліятэчных фондаў экстрэмісцкіх выданняў.

Асобная размова ішла пра культурнае імпартазамяшчэнне.

— Мы гаворым аб тым, як культываваць, прапагандаваць і ўкараняць у жыццё наша, — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

Аб выпрацоўцы адзіных падыходаў да культурнага імпартазамяшчэння расказаў Анатолій Маркевіч. Паводле яго слоў, падрыхтаваны праект адпаведнай канцэпцыі на 2024—2026 гады. Яна будзе распаўсюджвацца на ўсе сферы жыцця грамадства.

— Мэтай з'яўляецца забеспячэнне культурнай бяспекі Беларусі, — адзначыў міністр.

Сярод галоўных задач культурнага імпартазамяшчэння — дынамічнае развіццё нацыянальнай культуры, увасабленне каштоўнасцей і традыцый беларускага народа ў прадуктах матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Асаблівая ўвага ў дакуменце нададзена захаванню гісторыка-культурнай спадчыны і народных традыцый, развіццю нацыянальнай мастацкай культуры. Асобныя напрамкі датычацца культуры побыту, грамадскіх адносін і вытворчасці. Для рэалізацыі канцэпцыі распрацаваны план мерапрыемстваў, які ўключае больш за 200 пазіцый.

Парады з нарады

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 5 снежня. Дзякуючы відэасувязі, у сходзе таксама паўдзельнічалі кіраўнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Анатолій Мечыслававіч пракаментаваў галоўныя падзеі тыдня — пасяджэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савета па культуры пры галіновым міністэрстве. На першым ведамства прадстаўляла справаздачу па падрыхтоўцы канцэпцыі імпартазамяшчэння ў галіне культуры. Анатолій Маркевіч у цэлым ухваліў работу, канстатаваўшы, што праект практыка-арыентаваны. Пры гэтым мяркуецца ўдасканаліць паказчыкі, па якіх будзе ацэньвацца выкананне канцэпцыі. Што тычыцца пасяджэння Савета па культуры, кіраўнік сферы заўважыў, што падобныя мерапрыемствы павінны стаць пляцоўкай для канструктыўных дыскусій.

Удзельнікі нарады прызналі станоўчымі вынікі сёлетняга Мінскага міжнароднага фестывалю “Лістапад”. Адзначалася вялікая цікаўнасць да яго як кінематаграфістаў, так і гледачоў. “Выканана каласальная работа ў Мінску і рэгіёнах па арганізацыі паказаў фестывальных фільмаў, сустрэчы гасцей і правядзенні ва ўстановах культуры майстар-класаў з акцёрамі і рэжысёрамі”, — сказаў Анатолій Маркевіч. Міністр падкрэсліў, што фестывальная актыўнасць павінна не абмяжоўвацца датамі адкрыцця і закрыцця форуму, а доўжыцца круглы год. Папярэднічаць падзеі мусіць праца з патэнцыяльнымі гледачамі, якая прыцягне іх на паказы ў межах свята. А пасля найлепшыя карціны належыць выпусціць у айчынны кінапракат. Міністр даў адпаведныя даручэнні кіраўніцтву “Беларусьфільма”.

Падчас нарады таксама быў разгледжаны шэраг арганізацыйных пытанняў. Яны адносяцца да конкурсу творчасці людзей з інваліднасцю “Час моцных”, справаздачных канцэртаў майстроў мастацтваў розных абласцей Беларусі ў Палацы Рэспублікі, ушанавання пераможцаў сёлетніх Дэльфійскіх гульняў і ўрачыстай цырымоніі перадачы статусу “Культурная сталіца Беларусі” Бялынічам ад Слуцка.

Дзеля ўзбагачэння тэатральных культур

Скарбонка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага папоўнілася новай узнагародай: калектыву прысуджаны прыз XXI Міжнароднага тэатральнага форуму “Залаты Віцязь”.

Сцэна са спектакля "Ідыёт"

На цырымонію 8 снежня ў тэатр запрошаны ганаровыя госці з Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Парламенцкага сходу Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, пасольстваў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, партыі “Белая Русь”. На вялікую сцэну выйдуць віноўнікі ўрачыстасці. Узнагароду мусіць паднесці Мікалай Бурляеў — народны артыст Расіі, прэзідэнт Славянскага форуму мастацтваў “Залаты Віцязь”, старшыня агульнарасійскага грамадскага руху “Культурны фронт Расіі”, старшыня Камісіі па культуры, навуцы і адукацыі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, першы намеснік старшыні Камітэта Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу РФ па развіцці грамадзянскай супольнасці, пытаннях грамадскіх і рэлігійных аб'яднанняў.

Міжнародны тэатральны форум “Залаты Віцязь” ладзіцца ў межах Славянскага форуму мастацтваў з 2002 года з мэтай умацавання традыцый рускага рэалістычнага тэатра, класічнай тэатральнай школы. Сярод галоўных задач таксама пашырэнне творчых сувязей, узаемнае ўзбагачэнне тэатральных культур славянскіх народаў, папулярызацыя нацыянальнай класічнай драматургіі.

У 2005-м тэатральны фестываль праходзіў у Мінску, сёлета — у Маскве. Мерапрыемства праводзілася пры падтрымцы Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі і ўдзеле агульнарасійскай грамадскай арганізацыі “Культурны фронт Расіі”.

У конкурснай праграме прадставілі спектаклі тэатры з Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Арзамаса (Ніжагародская вобласць), Буінска (Татарстан), Уладзікаўказа (Паўночная Асеція — Аланія), Уладзіміра, Луганска (Луганская Народная Рэспубліка), Мыціішчаў (Маскоўская вобласць), Самары, Чэбаксараў (Чувашская Рэспубліка), Чэлябінска, Яраслаўля, Бялграда (Сербія).

Прыз XXI Міжнароднага тэатральнага форуму адправіўся ў Мінск: калектыў тэатра імя М. Горкага атрымаў “Залатога Віцязя” за спектакль паводле Ф. Дастаеўскага “Ідыёт”.

“І драму, і камедыю” ў дзвюх дзеях у 2022—2023-м паставіла Івана Жыган. Сербская актрыса, сцэнарыст і рэжысёр узяла за аснову інсцэніроўку 1995-га, аўтарам якой з'яўляецца яе бацька. На прэм'еры прысутнічаў прапраўнук Фёдара Дастаеўскага Аляксей з жонкай Наталляй і чатырма дзецьмі: Ганнай, Марыяй, Верай і Фёдарам. Спектакль — грандыёзная падзея для Беларусі.

Дарэчы, у лістападзе яго паказвалі на XXVII Міжнародным тэатральным фестывалі Ф. М. Дастаеўскага ў Вялікім Ноўгарадзе (Расія). Таксама “Ідыёт” (рэжысёры-пастаноўшчыкі — Стэва Жыган, Івана Жыган, сцэнаграфія — Барыс Максімавіч, Ала Сарокіна) удастоіўся Нацыянальнай тэатральнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галоўнай намінацыі “Найлепшы спектакль тэатра драмы”.

Ніколі не забудзем!

Мемарыяльны комплекс на месцы Азарыцкага лагера смерці заўтра ўпершыню пасля рэканструкцыі прыме наведвальнікаў. Далучыцца да ўрачыстай цырымоніі адкрыцця могуць усе ахвотныя.

Маштабнае абнаўленне комплексу пачалося гэтай вясной. У выніку работ пашырана тэрыторыя, створаны новыя тэматычныя лакацыі. Мемарыял уключае вежу памяці, камяні прасвятлення, зону памяці з магчымасцю ўскладання кветак і вянкоў, пано з архіўнымі фотаздымкамі, знак у гонар ваенных медыкаў, што спынілі распаўсюджанне тыфу. На краі багны ўзвышаюцца паклонныя крыжы. У гэтай жа частцы комплексу размясцілася аглядная пляцоўка.

Рэканструкцыя сапраўды з'яднала беларусаў розных пакаленняў. Уклад у справу ўнеслі ўдзельнікі рэспубліканскага суботніка: палова зароблених сродкаў выдаткавана на абнаўленне мемарыяльнага комплексу. Акрамя таго, талакой на аб'екце працавалі прадстаўнікі органаў улады, мясцовыя жыхары, студатрады.

Азарыцкі лагер смерці быў створаны ў сакавіку 1944 года. Тут упершыню выкарысталі бактэрыялагічную зброю — узбуджальнік сыпнога тыфу. Нямецкія ворагі разлічвалі, што жывы шчыт з хворых людзей забяспечыць захопніцкай арміі адвод і заразіць савецкіх салдат-вызваліцеляў. Лагер праіснаваў усяго 10 дзён, але за гэты час у ім загінула не менш за 20 тысяч чалавек.

Свята оперы

XIII Мінскі міжнародны Калядны оперны форум пройдзе з 10 па 15 снежня. У праграме — два спектаклі нашага Вялікага тэатра і два гасцявыя, а таксама фінальны гала-канцэрт.

Асаблівасцей сёлетняга фестывалю таксама дзве. Першая — ён распачынаецца абсалютнай беларускай прэм'ерай: менавіта 10 снежня айчынным гледачам упершыню прадэманструюць новую пастаноўку апошняй оперы П. Чайкоўскага — “Іаланта”. Штораз Вялікі ўключае ў афішу свята оперных спектаклі, прадстаўленыя пасля ранейшага форуму. Але “Іаланта” ў прачытанні трох творчых кіраўнікоў тэатра (галоўнага рэжысёра, галоўнага дырыжора, галоўнага мастака) — пакуль чарговая загадка: першы паказ будзе адкрыццём фестывалю. А ўрачыста-гімнічным ці казачна-лірычным — даведаемся толькі ў нядзелю. Ганна Маторная хіба крыху прыўзняла завесу тайны:

— У оперы злучана сярэднявечная французская легенда, містычнае адчуванне, сімволіка, сакральнасць, праваслаўная духоўнасць — і на гэтай аснове створана сапраўднае літургічнае дзейства.

Другая адметнасць форуму — прыезд са спектаклямі адразу двух замежных тэатраў. Так-так, не проста салістаў, якія выканаюць асобныя нумары ці паўдзельнічаюць у нашых спектаклях, а менавіта калектываў — прычым яны падрыхтавалі оперы, што ў нас не ідуць і не ішлі. Вялікі тэатр Узбекістана імя А. Наваі прывозіць “Шукальнікаў жэмчугу” Ж. Бізэ, а Самарскі акадэмічны тэатр оперы і балета імя Д. Шастаковіча — “Любоў да трох апельсінаў” С. Пракоф'ева. Дырыжыраваць той “трапічнай садавіной” будзе Яўген Хахлоў.

Своеасаблівай прэамбулай свята стане канцэрт лаўрэатаў Міжнароднага конкурсу імя П. Чайкоўскага. Імпрэза пройдзе 8 снежня, акурат у Дзень Саюзнай дзяржавы.

Сцэны са спектакля "Ціха тут на досвітках"

З павагай да свайго

У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы 4 снежня прайшло пасяджэнне Савета па культуры пры Міністэрстве культуры. Мерапрыемства было прысвечанае патрыятычнай тэматыцы ў сучасным мастацтве.

Пасяджэнню Савета па культуры папярэднічалі прагляд спектакля студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў "Ціха тут на досвітках" і выстава намінантаў ды пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на найлепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі. Удзел у пасяджэнні ўзялі кіраўнікі дзяржаўных органаў, сталічных і абласных устаноў ды арганізацый культуры і адукацыі, а таксама прадстаўнікі творчых саюзаў пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў і кінематаграфістаў.

ЗАХАВАЦЬ СУВЕРЭНІТЭТ

Як адзначыў міністр **Анатолій Маркевіч**, тэма патрыятызму з'яўляецца надзвычай актуальнай для сучаснага грамадства.

— У любой сітуацыі першаснымі робяцца менавіта тыя пачуцці, якія дазваляюць разумець прыналежнасць да краіны, дзе ты жывеш, і да тых працэсаў, якія там адбываюцца. Існуе меркаванне, што ад аднаго чалавека нічога не залежыць, але гэта абсалютна няправільнае мысленне, бо кожны чалавек робіць свой унёсак у агульны здабытак нашай краіны, і ні ў якім разе нельга быць стороннім назіральнікам. Калі мы выхоўваем сапраўдных патрыётаў, то шматлікія пытанні адпадаюць самі сабой, бо такі чалавек перадусім думае аб тым, што ён зрабіў для сваёй радзімы. На патрыётах трымаецца краіна, і нават калі з'яўляецца складаная сітуацыя, пачуццё патрыятызму дазваляе захаваць нашы суверэнітэт і незалежнасць. Самае галоўнае — любіць радзіму не на словах, а на справе, даводзіць гэта сваімі ўчынкамі ва ўсіх напрамках і праявах сучаснага жыцця. Вучань, які старанна вучыцца і выконвае сваю работу, студэнт, які авалодвае прафесіяй, рабочы ля станка, які вырабляе вельмі важную прадукцыю, начальнік, які пераймаецца развіццём сваёй прадпрыемства, або юнак, які служыць ва Узброеных Сілах, — кожны з'яўляецца патрыётам сваёй краіны, бо думае аб яе будучыні.

Міністр таксама дадаў, што сфера культуры з'яўляецца флагманам патрыятычнага выхавання, бо праз спектаклі, канцэрты, выставы спрабуе паказаць актуальныя тэмы, якія цікавяць грамадства і даюць магчымасць зарыентавацца ў няпростай сістэме каардынат. Як падкрэсліў Анатолій Маркевіч, цяпер мы асабліва востра ўсведамляем неабходнасць захавання традыцыйных каштоўнасцей дзяржавы, фарміравання ідэалаў, поглядаў і перакананняў грамадзян, іх разумення нашага гістарычнага шляху. А патрыётамі так проста не робяцца, і тут на варце стаіць культура. Калі мы аб'яднаем намаганні, то і спектаклі, і канцэрты, і фестывалі, і лекцыі будуць садзейнічаць не толькі асвеце і патрыятычнаму выхаванню дарослага і маладога пакалення, але і іх удзелу як актыўных стваральнікаў.

ПАДТРЫМКА ПАТРЫЁТАМ

Начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Кацярына Усава** адзначыла, што ў 2021—2022 гадах пры падтрымцы гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь рэалізавана шэсць праектаў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці аб подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. У 2023-м грантавую падтрымку атрымалі пяць культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі: спектакль Брэсцкага тэатра лялек "Еўфрасіння Полацкая. Святыя літары", праект "Лінія памяці. Код вайны" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, выставачны фотадакументальны праект "Скрадзенае дзяцінства" Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, выставачны праект "Вобраз радзімы ў творчасці беларускіх мастакоў XVIII—XII стагоддзяў" Нацыянальнага мастацкага музея і спектакль "Двор майго дзяцінства" Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **Наталля Карчэўская** распавяла аб досведзе падрыхтоўкі новага пакалення творчых работнікаў шляхам іх удзелу ў рэалізацыі культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі, у тым ліку праз стварэнне музычна-харэаграфічных пастановак, відэапраектаў, арт-аб'ектаў у гарадскім асяроддзі і 3D-мадэляў помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Між іншага прагучалі прапановы аб увядзенні практыкі заказу студэнцкіх дыпломных праектаў арганізацыямі культуры, а таксама аб увядзенні намінацыі "Дэбют" у рамках нацыянальных прэмій у сферы культуры.

Падчас пасяджэння

З выставы праектаў патрыятычнай тэматыкі

НІХТО, АКРАМЯ НАС

Генеральны дырэктар Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы **Ганна Сенькавец** падзялілася досведам і праблемамі фарміравання сучаснага патрыятычнага рэпертуару, а дырэктар Цэнтра па падтрымцы літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі **Анатолій Матвіенка** паразважаў над пытаннем стварэння п'ес і лібрэта для пастаноўкі спектакляў патрыятычнай тэматыкі. Звяртаючы ўвагу на рэпертуарную палітыку беларускіх тэатраў, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы **Ігар Марзалюк** падкрэсліў, што перадусім варта звяртацца да твораў айчынных аўтараў, якія раскрываюць патрыятычную тэматыку, непарыўна звязаную з нацыянальнай традыцыяй. Акрамя таго, ён звярнуў увагу на необходнасць стварэння яканых анімацыйных фільмаў на гістарычную тэматыку, адпаведных узроставым асаблівасцям дзіцячай і падлеткавай аўдыторыі.

Уладзімір Рылатка, колішні першы намеснік міністра культуры, таксама звярнуў увагу на неабходнасць абараняць на сцэне месца і ролю беларускай мовы і айчынных аўтараў, бо ніхто ў свеце, акрамя нас, гэтага не зробіць.

Падсумоўваючы дыялог аб патрыятызме ў мастацтве, Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што ў гэтай сферы нельга задавольвацца самасправаздачамі і самазаспакаеннем, таму размова на дадзеную тэму яшчэ будзе працягнутая і мусіць заўжды заставацца ў цэнтры ўвагі.

Антон РУДАК
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА
і з Тэлеграм-канала Міністэрства культуры

Адэкватная падача фактаў

Як карэктна пагаварыць на балючую тэму?

У прэс-клубе "Культура і мастацтва" 30 лістапада адбылася відэаканферэнцыя-практыкум, прысвечаная адлюстраванню генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў экспазіцыях устаноў культуры і школьных музеях.

Удзельнікі відэаканферэнцыі: Ірына Карповіч, Міхаіл Дайнека, Рыма Рум і Аляксандра Кравец

Начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры **Ірына Карповіч** адзначыла, што ў 2022 годзе музеі ўсёй краіны адкрылі экспазіцыі, прысвечаныя генацыду беларускага народа. У 2023-м, напярэдадні 80-годдзя вызвалення краіны ад нацыстаў, гэтую тэму пачалі шырока асвятляць бібліятэкі і клубы, а таксама ўстановы адукацыі. Каб падзеі генацыду адлюстроўваліся дакладна і адэкватна, Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны даручылі распрацаваць адпаведныя метадычныя рэкамендацыі. У іх будуць ахарактарызаваны напрамкі, на якія неабходна арыентавацца пры падрыхтоўцы выстаў і мерапрыемстваў.

Інтэрактыўны інфармацыйны стэнд з дапоўненай рэальнасцю

ДЗЕ ШУКАЦЬ?

Гаворачы аб метадычных рэкамендацыях па фарміраванні экспазіцый пра генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, старшы пракурор упраўлення па наглядзе за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Генеральнай пракуратуры **Міхаіл Дайнека** згадаў крыніцы і аб'екты, якія могуць быць прадстаўлены. Гэтыя дакументы і прадметы можна атрымаць у раённых і аб'яднаных міжраённых ваенных камісарыятах — як, напрыклад, артэфакты, выяўленыя падчас пошукаў, што праводзяцца на месцах воінскіх пахаванняў або на месцах знішчэння і пахавання мірнага насельніцтва.

У архівах даступныя як рукапісныя, друкаваныя, так і фота-, відэа- ці фонадакументы. У першую чаргу гэта крыніцы, якія датычацца акупанцкіх злачынстваў і нанесенага фашыстамі ўрону, зафіксаваных падчас работы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, што дзейнічала ў 1944—1946 гадах. На згаданых носьбітах адлюстравана колькасць асоб, знішчаных або загнаных у няволю, а таксама сума прычыненай гітлераўцамі шкоды. Акрамя таго, каштоўнымі крыніцамі стануць дакументы партызанскіх злучэнняў і ўспаміны партызан, ваеннапалонных, былых вязняў нацызму. Яшчэ ў экспазіцыях можна выкарыстоўваць аўдыя- і відэазапісы з паказаннямі відавочцаў, дапытаных у рамках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа.

У 2023-м, напярэдадні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гэтую тэму пачалі шырока асвятляць установы культуры і адукацыі.

ДАСТУПНЫЯ СВЕДЧАННІ

Па ўзгадненні з супрацоўнікамі абласных пракуратур, якія курыруюць крымінальную справу аб генацыдзе беларускага народа, можна ўзяць матэрыялы, сабраныя падчас расследавання, а таксама прадметы з раскопак у яго межах. Асноўныя напрамкі расследавання — удакладненне звестак пра часткова або цалкам знішчаныя населеныя пункты і іх жыхароў, пра колькасць лагераў смерці, якія дзейнічалі на тэрыторыі акупаванай Беларусі, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, пра абставіны і лакацыі карных акцый; устанаўленне раней невядомых месцаў знішчэння і пахавання мірнага насельніцтва; арганізацыя і правядзенне пошукавых работ на такіх пляцоўках і ўвекавечанне раней невядомых пахаванняў ахвяр.

Некаторыя дакументы, здабытыя ў ходзе расследавання, апублікаваны на сайце Генеральнай пракуратуры. На ім жа можна азнаёміцца з падрыхтаванымі падчас расследавання зборнікамі інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў і крыніц. Акрамя таго, на партале змешчаны архіўныя дакументы, паказанні відавочцаў, карты, на якіх пазначаны спаленыя вёскі і лагеры смерці, з крымінальнай справы. Звяртаючы ўвагу на дзейнасць ваенна-патрыятычных гурткоў у школах, Міхаіл Дайнека падкрэсліў, што іх удзельнікі могуць таксама далучыцца да фарміравання экспазіцый школьных музеяў пра генацыд, прадставіўшы дакументы і сведчанні нават з уласных сямейных архіваў.

ВЫХАВАННЕ ПАМЯЦІ

Загадчык аддзела краязнаўства і патрыятычнага выхавання Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства **Аляксандра Кравец** распавяла, што цяпер у рамках акцыі "Іх подзвіг у памяці нашчадкаў захаваем", зладжанай Міністэрствам адукацыі, адбываецца адмысловы конкурс. На яго паступіла каля 600 даследчыцкіх работ у намінацыях "Герояў памятаем імёны", "Да подзвігу герояў дакраніся" (у другой разглядаюцца сацыяльныя праекты). Сёння ў сістэме адукацыі па ўсёй краіне дзейнічае каля 1500 музеяў, з іх прыкладна 200 мае ваенна-гістарычны профіль.

Спецыфіка падобных скарбніц у тым, што яны, як правіла, стваралісь самімі апекаванцамі навучальных устаноў. Асноўная функцыя такіх музеяў — выхаванне і адукацыя, а форма работы — практыка-арыентаваная. То-бок падчас даследчыцкай дзейнасці і экспанавання сабраных прадметаў навучэнцы атрымліваюць навыкі музейнай працы, а пасля захоўваюць цікаўнасць да гісторыка-культурнай спадчыны і спрыяюць яе збяражэнню.

УВАГА ДА ЭМОЦЫЙ

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **Рыма Рум** прыгадала, што тэма генацыду беларускага народа адлюстравана таксама ў творчасці маладых мастакоў, якія ўдзельнічалі ў конкурсе работ, зладжаным летась мемарыяльным комплексам "Хатынь".

Як падкрэсліла Ірына Карповіч, пры стварэнні экспазіцый і падчас экскурсій, прысвечаных генацыду, трэба быць уважлівымі да ўздзеяння, якое можа аказаць такая далікатная і трагічная старонка гісторыі на эмацыйны стан дзіцяці. Таму, напрыклад, нядаўна адкрыты музей у мемарыяльным комплексе "Хатынь" не рэкамендуецца наведваць хлопчыкам і дзяўчынкам да 12 гадоў. Такія экспазіцыі разлічаны ўсё ж на пэўным чынам падрыхтаванага гледача, а для розных узроставых груп неабходная адпаведная падача. Рыма Рум таксама зазначыла, што ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны тэму генацыду спрабуюць раскрываць вучням 8—11 класаў — больш гатовым да ўспрымання такога матэрыялу.

Антон РУДАК
Фота аўтара
і Уладзіміра ШЛАПАКА

Экспазіцыя музея ў мемарыяльным комплексе "Хатынь"

Спраўджаныя мары Ганны Трубяцкой

“Чуць сэрцам” музыку і спяваць пра “Сіні край” на ўвесь свет

Ганна Трубяцкая зведала поспех на папулярных тэлепраектах, заваявала Гран-пры Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск-2022” на “Славянскім базары”. Перамогам паспрыялі мэтанакіраванасць і працавітасць, памножаныя на адоранасць. Гэтыя ж якасці не дазволілі спявачцы застацца сярод вечных канкурсантаў. Яе рэпертуар узбагачаецца ўласнымі хітамі, расце геаграфія выступленняў. Па ўсім відаць, што выканаўца дасягае мэты — быць артысткай высокага рангу”...

— Ганна, неяк вы казалі, што ў песні ўкладваеце шмат асабістага. Нядаўна вы парадавалі прыхільнікаў кампазіцыяй “Масты”. Што з уласнага досведу хацелі перадаць слухачам у новай рабоце?

— Сапраўды, у кожную песню я імкнуся ўкласці часцінку сябе. У гэтым і ёсць сэнс творчасці. У дадзеным выпадку пасыл такі: што б ні здарылася з табой, якія людзі ні пакідалі б тваё жыццё, варта памятаць, што ты ёсць у самога сябе. Няхай масты разведзены... Трэба шукаць сэнс найперш у сабе, а не ў іншым чалавеку. Думаю, гэты твор адгукнецца ў тых, хто калі-небудзь кахаў, калі-небудзь праходзіў праз расстанне.

— Нярэдка маладыя артысты, што ззялі на тэлевізійных праектах, пазней знікаюць з поля зроку. Перадусім таму, што не змаглі назапасіць уласны рэпертуар. А вы ўжо на “Славянскім базары” выконвалі кампазицыю, напісаную адмыслова для вас. Калі адчулі, што ў перапеўцы чужых твораў адчуваеце сябе цесна?

— Многія на пачатку кар’еры праходзяць праз выкананне песень іншых артыстаў. І я таксама была салісткай кавер-бэнда. Некалі выступала на розных святах, вяселлях. Гэта звычайны момант у біяграфіі артыста. Калі мая кар’ера пачала імкліва расці, стала зразумела, што выконваць чужыя кампазіцыі ўжо няправільна.

Я заўсёды марыла пра ўласныя творы, якія людзі будуць пазнаваць. Марыла, каб публіка спявала са мной. І літаральна пару месяцаў таму жаданне ажыццявілася. Падчас дыялогавай пляцоўкі “Разам з мастацтвам” я спусцілася ў залу, дала мікрафон адной дзяўчынцы. Яна палову кампазіцыі выканала сама. Згадваю той момант — і па скуры мурашкі.

Таксама я марыла, каб нехта прыйшоў з маёй песняй на тэлепраект. І гэта нядаўна здарылася. Цудоўны артыст Minas выступіў на шоу “Фактар.by” з кампазіцыяй “Прымусь мяне дыхаць”. Не магла не прыехаць на кастынг і не падтрымаць таленавітага хлопца.

Мой аўтарскі матэрыял прыжываецца, ён падабаецца людзям. А прыйшла я да гэтага, напэўна, таму, што хачу быць артысткай высокага рангу і прадстаўляць нашу краіну на міжнародным арэне. І без аўтарскага матэрыялу ніяк.

— Вы не толькі ствараеце песні самі, але і знайшлі агульную мову з іншымі аўтарамі. Прыкладам, плённым стала супрацоўніцтва з Леанідам Шырыным...

— Ён напісаў кампазіцыю “Чуць сэрцам” да майго сольнага канцэрта. Пакуль трэка няма на лічбавых пляцоўках, але неўзабаве выпраўлю гэта. Далей быў “Сіні край”, а затым мы рыхтавалі песню “Прымусь мяне дыхаць”. І штораз было пападанне ў кропку! Я вельмі скрупулёзная, уніклівая. Таму ўвесь час дакладна фармулюю запыты аўтару, каб атрымаць менавіта тое, што задумана. Леанід мяне заўсёды разумеў, упарадкоўваў мае часам сумбурныя творчыя ідэі. Працаваць разам заўжды было лёгка.

— У песнях вы паўстаяце вельмі пачуццёвай і нават танкаскурай. Разам з тым трансліруеце стойкасць, упэўненасць, мэтанакіраванасць. Якія выпрабаванні на творчым шляху даліся няпроста? Што дапамагло годна прайсці праз іх?

— У жыцці кожнага чалавека, які імкнецца да поспеху, ёсць узлёты і падзенні. Я не выключэнне. Раней доўгі час спявала ў кавер-бэндзе, у аркестры. Пераломным момантам было прыняцце рашэння аб сольнай кар’еры. Гэта няпросты крок, вялікая рызыка. Але яна ў рэшце рэшт апраўдалася.

Важным этапам стала маё з’яўленне ў Мінску. Калі ты раптам апынаешся ў сталіцы, людзі задаюць рознымі пытаннямі. Часам да мяне даходзілі не самыя прыемныя водгукі. Камусьці я не падабалася. Спатрэбілася ўспомніць аб стрыжні, аб пераадоленым шляху. Успомніць, што варта прыслухоўваць толькі да тых, каго ведаеш, паважаеш і любіш. Я дастаткова загартаваная: з самага дзяцінства на конкурсах і канцэртах. Вось і ў гэты раз справілася. Не пераломным, аднак складаным этапам быў “Славянскі базар”. Прадстаўляць краіну на міжнародным творчым форуме — сур’ёзная, вельмі адказная місія. Належала сабраць усе сілы і яшчэ раз паказаць сабе самой, на што я здольная.

— Між іншым, вы працягваеце ўдзельнічаць у конкурсах. Нядаўна заваявалі найвышэйшую ўзнагароду на ALMATYM JUREGIMDE (Казахстан). Што вас матывуе зноў пагружацца ў творчыя спаборніцтвы?

— Гэты конкурс вельмі важны, бо ў мяне была місія годна прэзентаваць Беларусь. Давялося спрачацца за перамогу з прадстаўнікамі 12 краін з вельмі моцнай вакальнай школай. Была сапраўдная бітва. І ўдзел у падобных мерапрыемствах дае магчымасць адкрыць нашу дзяржаву для замежнікаў. Адметна: фінал выпаў на Дзень народнага адзінства. Спачатку я засмуцілася, што не змагу выступіць на вялікім канцэрце ў “Мінск-арэне”. Але пасля паглядзела на сітуацыю з іншага боку. У святочны дзень 17 верасня на галоўнай плошчы Алматы прагучала назва нашай краіны: я атрымала Гран-пры. Калі выходзіла па ўзнагароду, разгарнула наш Дзяржаўны сцяг. Такім чынам, будучы за мяжой, я ўсе адно раздзяліла з суайчыннікамі радасць гэтага свята.

— Падчас шматлікіх конкурсаў і тэлепраектаў вы атрымалі высокія ацэнкі ад шэрага зорак. Гэта задае пэўную планку, да заўваг якіх асоб прыслухоўваецца. Чыё меркаванне для вас застаецца важным?

— Так, хоць мяне хваляць на розных праектах, я ўсё адно звяртаюся па альтэрнатыўны погляд, парады да невялікага кола асоб. Безумоўна, гэта родныя і блізкія, якія выдатна ведаюць мяне і зычаць мне толькі добрага: тата і мама, бабуля, хросная. Нярэдка прашу дапамогі ў дзвюх найлепшых сябровак. Напрыклад, нядаўна выбірала новы сцэнічны ўбор — і сяброўка-дызайнерка ўвесь час была на сувязі, давала падказкі.

— Вам раілі то змяніць імідж, то вылечыць сіпату ў голасе, якая насамрэч ёсць вашай фішкай. У гэтыя моманты таксама падтрымка блізкіх не дазволіла збочыць са сваёй дарогі?

— Маю настолькі моцнае ўнутранае апірышча, што ніхто не зможа мяне збіць з намечанага шляху, не вымусіць падумаць, што я іду не той дарогай. Жыцця без сцэны, без прафесіі спявачкі я ўжо не ўяўляю.

А вось у дзяцінстве вельмі дапамагла мама. Калі было складана зразумець, навошта хаджу ў музычную школу, навошта займаюся фартэпіяна ды вывучаю сальфеджыа, гармонію, музычную літаратуру, матуля патлумачыла, што я адораная і здольнасці варта развіваць. Яна сказала, што зроблена надта многа, каб здавацца. Калі я стамілася ад фартэпіяна, мама перавяла мяне на вакальнае аддзяленне. І дзякуючы таму я не кінула музычную адукацыю.

— Вы прычыніліся да маштабнага праекта “Разам з мастацтвам”, зладжанага Міністэрствам культуры. Што натхніла вас падключыцца да марафону і якія ўражанні ён пакінуў?

— Гэты праект вельмі значны для мяне. Я імкнуся падтрымліваць патрыятычныя ініцыятывы, бо хачу, каб наша краіна развівалася. Справа за моладдзю, як кажа Прэзідэнт. І мне было прынцыпова важна далучыцца да праекта, каб паразмаўляць з хлопцамі ды дзяўчатамі і на ўласным прыкладзе паказаць ім, як у Беларусі можна развіваць таленты і ўдасканальвацца.

Я прыкмеціла, што здольная ўплываць на творчую моладзь. Напрыклад, адна дзяўчынка пыталася, дзе лепш атрымліваць музычную адукацыю, а пасля нашай размовы перадумала ехаць за мяжу і вырашыла вучыцца далей на радзіме.

Даніл ШЭЙКА
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА і з архіва гераіні

Ганна Трубяцкая — уладальніца Гран-пры міжнароднага конкурсу ALMATYM JUREGIMDE

Вярнуцца ў дзяцінства

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, скончыўшы гасцінна прымаць спектаклі труп Беларусі і Расіі (і ў час правядзення Нацыянальнай прэміі, і падчас гастроляў), звярнуўся да тэатральных і музычных прэмер. На Камернай сцэне ўзнік “Двор майго дзяцінства”, здзейснены на грант Прэзідэнта Беларусі ў сферы культуры.

За немудрагелістай назвай прэм’ернага спектакля, пастаўленага рэжысёрам Данілам Філіповічам на аснове дзённікавых нататак, хаваецца прысвячэнне гораду — вядома, Мінску. Больш за тое, мастак Аляксандр Камянец імкнуўся адштурхнуцца ў сцэнаграфіі ад рэальнай “дваровай тэрыторыі” — акурат таго дома, што стаіць насупраць тэатра. Думаеце, лянота была пашукаць нейкія іншыя двары, каб стварыць гэткую абагульненую выяву? А вось і не: такая ўвага да пэўнага дома дыктавалася тым, што тут жыў Васіль Вітка, вершы якога таксама выкарыстаны ў спектаклі. Радкі з “Азбукі” беларускага паэта-класіка становяцца своеасаблівым лейтматывам, падкрэсліваючы папраўдзе “азбучныя” ісціны сцэнічнай дзеі і выклікаючы ў гледача асабістае імкненне іх не проста зафіксаваць, а больш глыбока спасцігнуць і асэнсаваць.

Нягледзячы на наяўнасць у камандзе згаданага мастака-пастаноўшчыка і кампазітара Андрэя Цалко, з якімі ў Даніла Філіповіча склалася даўняе і вельмі плённае супрацоўніцтва, спектакль можна ў поўнай меры назваць аўтарскім: ён створаны паводле ўласных дзённікаў рэжысёра, якія той вёў у дзяцінстве. Гэта надае пастаноўцы асаблівае адчуванне не проста дакументальнасці, што бывае ўласціва сучаснаму тэатру (і асабліва пры звароце да тэкстаў, напісаных з выкарыстаннем тэхнікі вербацім), а яшчэ і біяграфічнасці. Разам з тым цалкам прылічыць прэм’еру да жанру баёпік (скарачэнне ад biographical picture) таксама нельга: праз сумесь дзённікавых запісаў і вершаў ствараецца абагульнены партрэт нават не пэўнага пакалення (бо ўзрост рэжысёра і паэта адпавядае як мінімум двум розным пакаленням — унукаў і дзядуль), а самога дзяцінства, не абавязкова прывязанага да канкрэтных дзесяцігоддзяў. На гэта скіраваная і тэматычная інсталяцыя-фотазона, змешчаная пры ўваходзе, што вядзе на Камерную сцэну: тут ёсць і зашмальцаваны цацачны мішка, і шахматы, і паветраны шарык “новай мадэлі”, надзьмуты геліем (у савецкія часы такія ўзоры былі распаўсюджаны ані не так, як цяпер).

Тым не менш у спектаклі, пазначаным 12+, прысутнічае акцэнт на некаторых відавочных прыкметах савецкага часу, прыкладам згадкі Леніна ў віткаўскіх вершах. Гэта акрэслівае асноўную мэтавую аўдыторыю не толькі цяперашняй прэм’еры, але і, у большасці, цяперашніх вячэрніх тэатральных паказаў. Ёсць і відавочнае адценне настальгіі, адзначанае Данілам Філіповічам у час прэс-канферэнцыі: маўляў, гэта адчуванне, што ўсе праблемы вырашаюцца на раз-два-тры, дастаткова толькі пстрыкнуць пальцамі, як у дзяцінстве.

Вядома, гэта перабольшванне, бо ў дзяцінстве таксама хапае балючых момантаў, пра што нагадваў колішні спектакль “Першы”. Але ж агульная атмасфера “Двара майго дзяцінства” — выключна светлая, амаль бесклапотная, калі галоўнай праблемай становіцца думка, як прайсці ў метро без жэтона. Працяглае камічна-парадыйнае вырашэнне гэтай сцэны — камедыйна-жанравая кульмінацыя спектакля. А ўспрыманне снегу як смутку, бо ўзімку памерла маці, амаль патанае на фоне агульнай радасці, што робіцца цэнтральнай фарбай сцэнічнага дзеяння. Пранікнёнай філасофскай кульмінацыяй, ад якой сціскаецца сэрца, адчуўшы стан чалавечай адзіноты, стаў невялічкі фрагмент са з’яўленнем цёткі Надзі — народнай артысткі Беларусі Зінаіды Зубковай. Побач з ёй усе крыкі-скокі моладзі натуральна сыходзяць на другі план — і спектакль, у рэшце рэшт, паўстае не замілаваным вітаннем дзіцячай непасрэднасці, а ўзнёслым гімнам мудрасці, памножанай на вышэйшы акцёрскі прафесіяналізм.

Сцэны са спектакля "Двор майго дзяцінства"

Мелодыі душы

Традыцыйныя “Музычныя вечары ў Купалаўскім” папаўняюцца некалькімі новымі праграмамі.

Адной з іх сталі “Мелодыі яўрэйскай душы” ў выкананні ансамбля “М-Клезмер бэнд”, дзе музыка суправаджалася шыкоўным канферансам Максіма Расохі — таго самага, які ўзначальвае Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр імя М. Фінберга, але адначасова кіруе яшчэ некалькімі творчымі праектамі з удзелам найлепшых салістаў, аркестравых музыкантаў і выкладчыкаў музычных ВНУ. А ўсё таму, што М. Расоха — адзін з самых актыўных, апантаных папулярызатараў нацыянальнай культуры, нястрымны ў рэалізацыі сваіх усё новых і новых ідэй.

Дарэчы, яўрэйскай музыкай ён займаецца гэтак жа грунтоўна, як і беларускай. У свой час “перакапаў” архівы ў пошуках забытых твораў. Падрыхтаваў безліч разгорнутых праграм айчыннай музыкі — як уласна беларускай, так і яўрэйскай тэматыкі. Зацікавіўся багатым яўрэйскім фальклорам, усёй нацыянальнай спадчынай беларускіх яўрэяў.

У складзе “М-Клезмер бэнда” такія знаныя лаўрэаты міжнародных конкурсаў, як скрыпач Алег Яцына, кларнетыст Віктар Пузыня — сын знакамітага майстра і рэстаўратара старадаўніх беларускіх музычных інструментаў, баяністка Ірына Каленчыц — дацэнт Акадэміі музыкі. У якасці гарманічнай падтрымкі — гітара, што часам нагадвала па гуку індыйскі сітар, а таксама кантрабас, ударныя. І над усім — душэўнае сапрана Ангеліны Белановіч, дацэнта Гродзенскага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Яе голас ліўся цалкам натуральна, без аніякага ўтрывання, пачуццёва ахінаючы ўсіх сардэчнай утульнасцю. Кларнет гучаў не акадэмічна, а менавіта паяўрэйску, з трапяткімі ўздрыгваннямі. Тое ж тычылася і скрыпкі. Баян не выбіваўся з адзінай канвы: часам схіляўся да віртуознасці, часам проста “дыхаў”, дапаўняючы размаітую тэмбравую палітру.

Сярод іншых твораў здзівіла выбітная п’еса ізраільскага кампазітара Юрыя Павалоцкага — “Калі б Афенбах быў клезмерам”, дзе афенбахаўскі Канкан з “Арфея ў пекле” загучаў на яўрэйскі манер. А ў яўрэйскіх мелодыях уразіла вельмі дакладнае размеркаванне паскарэнняў — не прыступкавымі зрухамі ў тэмпе, а адзінай вытрымманай лініяй.

30 снежня ў Купалаўскім — “Венскі навагодні канцэрт” Мінск-класік аркестра на чале з М. Расохам. А 28-га — прэм’ера “Ціха тут на досвітках”.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Дуэт, а кожны — сола

Дзве сяброўкі, якіх пазнаёміла Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, стварылі паспяховы дуэт. Гэта не сюжэт новага фільма, а рэальная гісторыя з жыцця Марыны Федосенка і Кацярыны Шакорда.

Марына Федосенка, Кацярына Шакорда

Дзяўчаты — стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Музыканты ўжо пакарылі сцэны Вялікага тэатра оперы і балета, Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Дома Масквы ды іншыя. А ў лістападзе перамаглі на Міжнародным конкурсе-фестывалі баяністаў і акардэаністаў "Прыз Санкт-Пецярбурга". Ці лёгка дуэту даўся дыплом лаўрэата I ступені ў намінацыі "Канцэртныя выканаўцы" і з чаго пачынаўся шлях у прафесію?

— Маленькай дзяўчынкай я захаплялася ўсім патроху: танцы, спевы, маляванне, — распавядае Марына Федосенка. — А паралельна заўсёды цікавілася вучобай: атрымлівала высокія адзнакі і ўдзельнічала ў алімпіядах. Музыка прыйшла ў жыццё, калі мне споўнілася восем. У выніку гэты занятак стаў маёй прафесіяй і хобі адначасова. А з акардэонам мяне пазнаёміла першая настаўніца ў бабруйскай музычнай школе. Я ўбачыла яго, пачула, як іграюць старэйшыя, — і літаральна закахалася. Яшчэ валодаю фартэпіяна, баянам, гуслямі.

Кацярына Шакорда згадвае свой старт:

— Мой тата скончыў Магілёўскую музычную школу № 1 па класе трубы. Бацька выбраў іншую прафесію, але і цяпер любіць іграць на фартэпіяна і гітары. Можна сказаць, што ён і далучыў мяне да свету музыкі. А бабуля была акардэаністкай, атрымала адукацыю ў Ленінградскім інстытуце культуры імя Н. К. Крупскай. У дзевяць гадоў я захацела навучыцца іграць на скрыпцы або фартэпіяна, але педагогі сказалі, што я не падыходжу па ўзросце. Тады мне прапанавалі паспрабаваць акардэон. Вось я і пазнаёмілася са Святланай Пятроўнай Гардзеенка, што прывіла мне любоў да гэтага інструмента. Акардэон я іграю на фартэпіяна, якое таксама вельмі паважаю.

— Вы студэнткі факультэта народных інструментаў (кафедра баяна і акардэона) Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Якія важныя ісціны зразумелі за пяць гадоў вучобы?

— На мой погляд, гэта самая прэстыжная ВНУ ў нашай краіне, — гаворыць Марына. — Вельмі хацела, каб у мяне выкладала Лідзія Віктараўна Скачко, першы прарэктар акадэміі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт. Так і атрымалася. Тут я навучылася шанаваць тонкасці выканання, планаваць час, эксперыментаваць. Зразумела, што калісьці зрабіла правільны выбар і ні кроплі не шкадую. Хачу, каб мае вучні ў будучыні таксама натхняліся мной, як я захапляюся сваімі педагогамі.

Дапаўняе сяброўку Кацярына:

— Я выбрала Акадэмію музыкі, таму што гэта найлепшая айчынная навучальная ўстанова ў нашай сферы. А яшчэ тут працуе чалавек, да якога я вельмі хацела трапіць у клас. Аляксандр Аляксандравіч Шувалаў — загадчык кафедры баяна і акардэона, дацэнт, цяпер — мой педагог па спецыяльнасці. Тут я зразумела, што няма мяжы дасканаласці. Да нас прыязджаюць таленавітыя музыканты, такія як Юрый Шышкін, Уладзімір Арлоў, Марыя Уласава. Пасля сустрэчы з імі разумееш, што заўжды ёсць да чаго імкнуцца і спыняцца на дасягнутым ні ў якім разе нельга.

— Дзяўчаты, якія асабістыя перамогі можаце назваць самымі значнымі?

— Я лаўрэат звыш 30 міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў як саліст, — кажа Марына. — Удастойвалася ўзнагарод спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. І цяпер часта выступаю сольна на канцэртах і конкурсах.

Пералічвае дасягненні і Кацярына:

— Я прызёр мноства творчых спаборніцтваў, у тым ліку такіх прэстыжных, як Міжнародны конкурс баяністаў і акардэаністаў імя М. І. Белабародава ў Туле, Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя І. І. Жыновіча. Акрамя таго, неаднаразова станавілася стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. За плячыма ў мяне багата канцэртаў.

— Вы маеце вялікі сольны вопыт, а як зарадзілася ідэя аб'яднацца?

— Дуэтам мы іграем трэці год, і ансамбль — гэта новы і вельмі цікавы этап у нашых жыццях, — адказвае Марына. — У творчай скарбонцы мноства сумесных выступленняў. Адно з самых запамінальных — сёлетні канцэрт у Вялікім тэатры оперы і балета на Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, дзе прысутнічаў Прэзідэнт. Яшчэ мы далучыліся да мерапрыемстваў у Доме Масквы, у Акадэміі музыкі і ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, у Ваенным акадэміі Рэспублікі Беларусь, на жаночым форуме ў оперным тэатры, у музычных каледжах і школах па ўсёй краіне і да многіх іншых.

— Дуэт узнік на другім курсе, калі ў нас з'явіўся такі прадмет, як клас ансамбля, — дадае Кацярына. — Але мы з Марынай пасябравалі раней і ўжо дакладна ведалі, што хочам працаваць разам. Выступаем часта і на самых розных пляцоўках. Бывае па некалькі канцэртаў на тыдні. Давалі мы і сольны — у Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў мінулай вясной. Маем разнастайны рэпертуар — ад арыгінальнай музыкі для баяна і акардэона да перакладанняў класікі. Сярод іх творы Барыса Марцьянава, Андрэя Бызава, Моцарта. На нейкіх выязных канцэртах іграем эстрадную музыку, на нейкіх толькі акадэмічную.

— Вас можна павіншаваць з нядаўняй перамогай на міжнароднай арэне! Чаму выраслі паўдзельнічаць у конкурсе-фестывалі баяністаў і акардэаністаў "Прыз Санкт-Пецярбурга"?

— Ідэю падала ў верасні наш педагог Лідзія Віктараўна Скачко, — кажа Кацярына. — Выкладчык прапанавала праграму, з якой мы маглі б выступіць. Абмеркавалі ўсё і вырашылі: едзем! Вядома ж, прывабіла новая пляцоўка для самарэалізацыі, сур'ёзная камісія, моцныя ўдзельнікі. Праз тыдзень ужо адправілі заяўку!

— У Санкт-Пецярбургу нас сустрэлі вельмі гасцінна. Хоць конкурс праходзіў у першы раз, быў арганізаваны на высокім узроўні. Мы выконвалі тры творы: музычныя ілюстрацыі да паэмы "Ноч у горнай даліне" (3-я, 4-я часткі), Concerto grosso (2-я, 3-я часткі) Яраслава Алексіва, "Цфасманіяду" Сяргея Янковіча. З апошняй п'есай асаблівая гісторыя. Яе калісьці напісаў беларускі кампазітар, які працуе ў Акадэміі музыкі, для аднаго баяна, а пазней па асобнай просьбе зрабіў перакладанне для нашага дуэта. Вось і з'явіўся новы, не пабаімся гэтага слова, хіт! — працягвае Марына. — Мы разумелі, што сыгралі добра, але ведалі, што канкурэнцыя вельмі высокая, што ў журы — сапраўдныя прафесіяналы. Таму пра вынікі, тым больш такія, нават не марылі! Дазналіся пра перамогу непасрэдна на гала-канцэрце. Сказаць, што былі ў захапленні, — не сказаць нічога. Доўга не маглі паверыць свайму шчасцю. Але адназначна з'явіўся стымул займацца яшчэ больш старанна і спрабаваць сілы ў музычных спаборніцтвах.

— Чаго ў будучыні чакаць ад вашага дуэта?

— Працягнем развівацца прафесійна! — хорам адказваюць сяброўкі. — Збіраемся ісці ў магістратуру. Хочацца і далей выступаць на розных канцэртах, мерапрыемствах, удзельнічаць у конкурсах і радаваць свайго гледача!

> Дуэтам мы іграем трэці год.
> Гэта новы і вельмі цікавы этап у творчым жыцці.

Настасся ЮРКЕВІЧ
Фота з архіва герояў

На цырымоніі ўзнагароджання

Дзіця дзвюх краін

Так сябе называе Яўгенія Караткевіч. Яе маці — з Расіі, бацька — з Беларусі. Паспяховая актрыса тэатра і кіно лічыць сваю працу ўнёскам ва ўмацаванне адносін паміж братэрскімі народамі. Што ўдалося зрабіць маладой таленавітай дзяўчыне? Размова пра рэальныя справы, творчыя планы і ўзнёслыя мары — напярэдадні знакавай для Саюзнай дзяржавы даты.

— Яўгенія, раскажыце пра сябе нашым чытачам.

— Я актрыса, спявачка, заснавальніца дабрачыннага фонду "Твае таленты так патрэбныя планеце" і арганізатар фестываляў з такой жа назвай. Гэта дабрачынныя беларуска-расійскія святы, на якіх дзеці з інваліднасцю па слыху і дзеці з сіндромам Даўна танчаць, а невідушчы хлопец з Масквы Даніял Хачатураў спявае. На сцэне Палаца Рэспублікі 15 лютага пры падтрымцы беларускага сенатара Дзмітрыя Баскава мы ўпершыню аб'ядналі дзяцей, якія слаба чуюць, з Беларусі і Расіі. У дабрачынным фестывалі ўдзельнічалі выхаванцы маскоўскай арганізацыі "Анёлы надзеі" і Мінскай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната № 13. Хлопчыкі і дзяўчынкі выступілі, я выканала свае песні. Усе вакальныя кампазіцыі суправаджаліся жэставымі спевамі. Гэта творчы кірунак, якому спецыяльна навучаюцца. Вельмі прыгожа і кранальна.

Другі фестываль "Твае таленты так патрэбныя планеце" адбыўся ў Маскве. Мы адвезлі нашых дзетак у Музей Перамогі, правялі экскурсію па сталіцы Расіі. Хачу адзначыць важную асаблівасць свята — аб'яднанне на сцэне хлопчыкаў і дзяўчынак з інваліднасцю і без яе. Мы вучым іх сябраваць і камунікаваць.

У мяне дзве радзімы. Мама — з Забайкалля. А тата — з вёскі Востраў Гомельскай вобласці. Бацька служыў у Чыце, там сустрэў маму, закахаўся і павёз яе ў Беларусь. Тут, у Магілёве, я і нарадзілася. Таму я дзіця дзвюх краін. Уся маміна лінія — Расія, Забайкалле. А татава — Беларусь. Мая праца — гэта мой унёсак у аб'яднанне і сяброўства народаў дзвюх дзяржаў.

Я вучылася ва УДІКу (ВГИК) у Сяргея Аляксандравіча Салаўёва і Валерыя Давыдавіча Рубінчыка. Паступіла да іх на бюджэт. На першым курсе Марк Захараў узяў мяне ў тэатр "Ленкам". Я працавала там восем гадоў. Акрамя таго, удзельнічала ў рок-мюзікле "Тод" гурта "Король и Шут". Выканала галоўную ролю ў мюзікле маскоўскага Тэатра кінаакцёра "Моцарт і Маргарыта", грала Маргарыту. Знялася амаль у 30 праектах.

— Для артыста першая галоўная роля ў поўнаметражным фільме — вялікая падзея...

— Хутка выходзіць на экраны драма Андрэя Карасава "Возера дзяцінства" з Дзмітрыем Харацьянам, народным артыстам РСФСР Аляксандрам Іванovым і мной у галоўных ролях. Гэта карціна пра малую радзіму. Я там граю, па сутнасці, саму сябе — дзяўчынку, якая піша вершы і песні, марыць праславіць свой край. І яе жаданне спраўджваецца. Гэты фільм стаў вялікай падзеяй у маім жыцці. Ён для мяне — Божае наканаванне.

Летась у Чыце на Забайкальскім міжнародным кінафестывалі дзякуючы стужцы "Мятны пернік" я пазнаёмілася з рэжысёрам Андрэем Карасавым. Праз месяц ён прапанаваў мне галоўную ролю ў новай карціне. Сыграць аднаго з асноўных персанажаў у поўным метры было маёй самай вялікай марай. І яна здзейснілася. Важна тое, што гісторыя нагадвае маю ўласную і супадае з ёй нават у тых момантах, якія па фільме з'яўляюцца казачнымі. У чэрвені мяне паклікалі, а ў жніўні я ўжо працавала ў гэтым праекце.

— Як вы пасябравалі з дзецьмі, якія слаба чуюць?

— Падчас здымак фільма мяне запрасілі ў цэнтр "Адкрыты свет". Раней, як і многія, я насцярожана ставілася да людзей з інваліднасцю. Але калі ўбачыла, як гэтыя хлопчыкі і дзяўчынкі спяваюць ручкамі, проста закахалася. Дзіма Ратнікаў вельмі мяне ўразіў. І ўжо назаўтра мы з аператарам фільма "Возера дзяцінства" Андрэем Мызнікавым паехалі да тых дзяцей зноў.

Узялі дзяўчынку Вераніку, развучылі з ёй жэсты і знялі кліп. Паказалі яго ў Маскве. Ролік усім спадабаўся, патрапіў у ратацыю тэлеканала Music Box Russia. Дзякуючы гэтаму відэа я пазнаёмілася з хорам хлопцаў, якія слаба чуюць, у Маскве. Аказалася, што яго кіраўнік Алена Арлова, як і я, родам з Магілёва. Мы вырашылі стварыць сумесны праект. А рэалізаваць яго дапамог першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр Лук'янаў. Мы знаёмыя з шасці-сямі гадоў. Ён ведае, што я вялікі патрыёт. Падчас майго чарговага прыезду на радзіму Аляксандр запрасіў паўдзельнічаць у навядзенні парадку ў мемарыяльным комплексе "Хатынь". Я пагадзілася. І там падчас акцыі БРСМ пазнаёмілася з членам Савета Рэспублікі Дзмітрыем Юр'евічам Баскавым, расказала яму пра наш праект і атрымала дзейсную дапамогу.

— Фактычна ўсе вашы мары ажыццявіліся. Што далей?

— Цяпер я хачу сыграць у ваенным фільме. Мне ўжо прапанавалі ролю, але пакуль пра гэта казаць рана. Мой тата — палкоўнік у адстаўцы. Хросны — таксама палкоўнік. Так што ў гэтай мары ёсць падмурак. У найбліжэйшы час планую правесці трэці фестываль "Твае таленты так патрэбныя планеце" ў Калонным зале Дома саюзаў у Маскве. А пасля Новага года, спадзяюся, у Беларусі адбудзецца прэм'ера фільма "Возера дзяцінства".

— Чаму вы з Магілёва паехалі паступаць у Расію, а не ў Беларускую акадэмію мастацтваў?

— Я ездзіла ў БДАМ на курсы да Ірыны Іванаўны Кабаевай. Больш за год у яе адзаймалася. Педагог усяліла веру, што мяне чакае Масква. Мама ж заўсёды падтрымлівала мае авантуры. А тата быў супраць. Ён казаў, што ў акцёраў ёсць свае дзеці, а я дачка палкоўніка. І па яго патрабаванні я да 9 класа рыхтавалася да вучобы ў Акадэміі МУС. Праўда, насамрэч хацела спяваць у ансамблі МУС.

Але я ўсё ж паступіла ў Маскоўскую дзяржаўную акадэмію харэаграфіі і паралельна ў ГПІС на завочнае, а таксама вучылася на акцёрскіх курсах у ММАТе (МХАТ). А ў наступным годзе мая мара спраўдзілася: я трапіла на адно з пяці бюджэтных месцаў ва УДІК. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі ўсе тыя веды, што ўвабрала за 13 гадоў у Магілёўскай дзяржаўнай гімназіі-каледжы мастацтваў.

— Ці даводзілася сутыкацца з бытавымі цяжкасцямі?

— Калі ездзіла ў першы раз паступаць у Маскву, чатыры разы начавала на Беларускім вакзале — гэта лічыцца? А яшчэ падчас працы ў рок-мюзікле "Тод" я гучна спявала ў інтэрнаце. Суседкі паскардзіліся, мяне выселілі. І некаторы час давялося жыць на гарышчы гэтага самага інтэрната...

— У вас ёсць сакрэт, дзякуючы якому спраўджваюцца жаданні?

— Нават два. У дзяцінстве мая баба Каця, якая жыла ў Забайкаллі, падарыла вялікага высушанага шчупака. Яны з дзедам злавілі яго. Бабуля казала, што шчупак казачны і здзейсніць усе мае мары. А пазней, у падлеткавым узросце, я завяла карту жаданняў. Тады гэта было модна. Дык вось, усе жаданні з яе спраўджваліся. Нават тыя, пра якія забывала. Толькі ўявіце: у Маскве неяк перамагаю ў конкурсе, і мяне ўзнагароджваюць паездкай на Кубу. Я вяртаюся ў Магілёў, дадому, гляджу на карту жаданняў, а там Карыбскія астравы, што я калісьці выпадкова выразала і наклеіла. Выпадковасці не выпадковыя.

— Вы вельмі жыццярадасны чалавек. Як захоўваеце ў сабе бадзёры настрой?

— Наш настрой і будучыня залежаць толькі ад нас. Мы атрымліваем тое, што выпраменьваем у гэты свет. Ведаю па сабе: калі пачынаю сумаваць, з'яўляюцца непрыемнасці. Я доўга не разумела гэтага. Але аднойчы негатыў і раздражнянасць прывялі да сапраўды складанай сітуацыі. Я пяць разоў сыходзіла жыць у манастыр Опціна пустынь. І там дасведчаныя людзі патлумачылі мне сутнасць граху засмучэння. Пасля гэтага я забараніла сабе сумаваць і крыўдзіцца. Трэба канцэнтравацца на тым добрым, што ёсць вакол нас...

Віктар ГАЎРЫШ
Фота з архіва гераіні

Скрозь церні да зорак

Ці зменяць “Кіношнікі” беларускі кінематограф?

Хутка на экраны выйдзе дэбютны фільм Кірыла Халецкага “Кіношнікі”. Якой атрымалася першая поўнаметражная карціна маладога рэжысёра і ці дасць яна старт абноўленай айчыннай кінавытворчасці?

Георгій Будз сыграў прадзюсара

Некаторыя гледачы азнаёміліся з гэтай работай на XXIX Мінскім міжнародным фестывалі “Лістапад”: беларуская стужка не толькі ўдзельнічала ў конкурсе “Кіно маладых”, але і стала фільмам адкрыцця. Па выніках форуму “Кіношнікі” атрымалі дзве ўзнагароды. Аднак запомніцца ўсім не золата прызоў, а атмасфера ў сталічным кінатэатры “Беларусь”: поўная зала ў суботнюю раніцу і працяглыя апладысменты падчас цітраў.

ПРА ТОЕ, ШТО БЛІЗКА

Лірычная камедыя ў нейкай ступені аўтабіяграфічная. Малады рэжысёр Коля (Станіслаў Пякарскі) трапляе па размеркаванні на кінастудыю і, каб зняць фільм, праходзіць праз шэраг выпрабаванняў. Сюжэт, пабудаваны на асабістым вопыце Кірыла Халецкага, зразумелы кожнаму. На месцы рэжысёра мог апынуцца любы іншы малады спецыяліст, які гарыць сваёй працай і павінен пераадолець агонь, ваду і медныя трубы не толькі каб даказаць нешта гэтаму свету, але і каб зразумець важныя рэчы для сябе. Такі пасыл — першы плюс для гледача. Другі не змушае сябе чакаць: у сюжэта фільма нескладаная структура, а выбар лірычнай камедыі ў якасці жанру дазваляе ў лёгкай форме распавесці пра вечныя каштоўнасці, адна з якіх — жывая душа мастацтва.

Рэжысёр закранае даволі балючую тэму — мастацтва супраць грошай. Яна актуальная і для кінематографа ўвогуле, бо знайсці баланс паміж аўтарскім увасабленнем і камерцыйным патэнцыялам атрымліваецца не ва ўсіх. Аднак галоўная думка, якая гучыць з вуснаў герояў і чырвонай ніткай пранізвае гісторыю, — ідэя прэваліруе над выгадай. Поспех фільма не тлумачыцца коштам камеры, асноўнае ў карціне — замысел, здольны кранаць гледача. Гэта даволі натхняльны меседж, асабліва для творчай аўдыторыі, якой знаёмая барацьба схаванага патэнцыялу і страхаў.

Шануючы традыцыі і дасягненні мэтраў, спалучаючы веды з актуальнымі павевамі, аўтары стварылі нешта ўнікальнае для беларускага кіно — карціну пра нас сённяшніх.

Аляксей Анісеня — экранны Ігар

Кадр з фільма "Кіношнікі"

Лаліта Таборка ў ролі Алены і Станіслаў Пякарскі ў ролі Колі

ДАНІНА ПАВАГІ

Даволі нечаканым аказалася багацце візуальных і кантэкстных адсылак рэжысёра да культавых твораў кінематографа. Нечаканым і вартым павагі, бо карціна становіцца цікавай не толькі мэтавай аўдыторыі — моладзі. Ніводны элемент фільма не выкарыстоўваецца проста так. Аўтары ўжываюць усе магчымасці кіно як аўдыявізуальнага мастацтва, каб распавесці гісторыю захапляльна. Цытаванне рэплік са стужак Балабанава адным з антаганістаў разам з майстэрскімі ракурсамі аператара Уладзіміра Казіятці, дзякуючы якім герой нібыта займае месца Мікіты Міхалкова на постары крымінальнай камедыі “Жмуркі”, раскрываюць характар персанажа з першых хвілін яго з’яўлення на экране.

Ёсць у карціне і іншыя адсылкі, больш “лакальныя”, у якіх заключана актуальная для жанру “Кіношнікаў” самаіронія. Тонкую насмешку адчуюць тыя, хто знаёмы з рэжысёрам і яго папярэднімі работамі. Напрыклад, фільм, раскрытыкаваны героем Юрыя Цвіркі, — гэта першая кароткаметражка Халецкага “Дарога”. Ёсць і абяцанае камеа самога Кірыла. Ён паўстае ў вобразе занадта самаўпэўненага ўдзельніка фестывалю. Хоць персанаж і эпізадычны, на яго фоне кантрасна выдзяляюцца сапраўдныя каштоўнасці пратаганіста.

ПА СТАНІСЛАЎСКІМ

Як можна заўважыць, усе героі ў “Кіношніках” — ад галоўных да другасных — дапамагаюць плаўнаму перагортванню сюжэтных старонак. За гэта варта падзякаваць аўтарам сцэнарыя. У фільме лёгка прасочваюцца ключавыя архетыпы, што становяцца трывалымі каркасамі для вобразаў. Тут саюзнікі, і брамнікі, і, самае важнае, настаўнікі.

Для фільма выбраны дакладныя ўзроўні канфліктаў. Асноўныя, унутраныя, выяўленыя ў душэўных пакутах і барацьбе Колі з несправядлівасцямі на шляху да высакароднай мэты — стварыць мастацтва. А каб гэты канфлікт не сышоў у глыбокую псіхалогію і не зрабіў з лірычнай камедыі драму, праблему дапамагаюць раскрыць і знешнія фактары: саперніцтва з прадзюсарам, апанаваным асабістай выгадай, і яго братам, які прасоўвае ў масы сумнеўныя анлайн-курсы.

У апошнім ярка ўвасоблены падтэкст важнасці акадэмічных ведаў у кінаіндустрыі — адной з нямногіх, у якой самаадукацыя не дапаможа замацавацца.

Але колькі б мы ні хвалілі годны сцэнарый з усімі паўтонамі-падтэмамі і ўтоенымі сэнсамі, фільм атрымаўся і дзякуючы майстэрству акцёраў. Безумоўна, варта адзначыць вядучую партыю Станіслава Пякарскага. Яго персанаж зразумелы і блізкі гледачу ўнутранай барацьбой з прымхамі і знешняй — з абставінамі. Артысту ўдалося адкрыць сэрца Колі мякка, без напружання, таму галоўны герой выглядае шчырым у думках і перакананнях, а таксама ў пачуццях да каханай. І хаця роля не дазволіла Станіславу адлюстраваць увесь патэнцыял эмацыйнай палітры (бо жанр камедыйны), змена настрою пратаганіста нават у дробных адценнях прадэманстравана без фальшу.

Выклікала прыхільнасць і Лаліта Таборка, выканаўца ролі Алены. Да персанажа складана не пранікнуцца любоўю: гераіня спагадлівая, жвавая, гатовая ў любы момант дзейнічаць, але ў той жа час разважлівая. Актрыса здолела збалансаваць розныя рысы характару Алены. Адзін з найлепшых жаночых вобразаў на беларускім экране!

Але сапраўдным адкрыццём года стаў Юрый Цвірка. Акцёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з’явіўся на кінаэкране ўпершыню. І шмат у чым гэта заслуга рэжысёра. Ён разгледзеў у Юрыю камедыйны тыпаж, які аказаўся самым гучным акордам акцёрскага аркестра. Тая лёгкасць, з якой артыст выконвае партыю персанажа, зачароўвае і імгненна ўключае цікавасць гледача. І вось мы ўжо не можам адарваць вачэй ад “аскараноснага” героя. З такой ювелірнай дакладнасцю стварыць вобраз веселуна, які валодае жыццёвай мудрасцю і выступае настаўнікам галоўнага героя, здольны толькі майстар.

ЗАМЕСТ КРОПКІ

“Кіношнікі” — першая беларуская стужка, якая можа пачаць новую старонку ў 100-гадовай гісторыі айчыннага кінематографа. Шануючы традыцыі і дасягненні мэтраў, спалучаючы веды з актуальнымі павевамі, аўтары стварылі нешта ўнікальнае для беларускага кіно. Нешта, чаго даўно чакала публіка, — карціну пра нас сённяшніх. Ці прайдуцца даспадобы “Кіношнікі” беларускаму гледачу, даведаемся зусім хутка. Шукайце фільм у кінатэатрах свайго горада з 14 снежня!

РЭЙТЫНГ: ★★★★★

Яўгенія ГАБЕЦ

У этнаграфічным комплексе гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе” ідзе рамонт. Назіраючы, як рабочыя шчыруюць на рыштаваннях, замяняюць пачарнелыя дошчачкі на свежую залацістую дранку — літаральна сёлетнюю, міжволі задумваешся пра вечнае і часовае. Дакладней, пра тое, што ж зяўляецца самым важным у захаванні спадчыны. І ў выніку прыходзіш да высновы: пытанне гэта складанае — як той казаў, дыялектычнае.

Замена пакрыцця даху — справа непазбежная

Жыццёвы цыкл драўлянага помніка

ТЭРМІН ПРЫДАТНАСЦІ ДРЭВА

Па словах намесніцы дырэктара музея-запаведніка **Ксеніі Сямашка**, пачаліся працы вельмі своечасова: на пакрыцці даху сям-там з’явілася цвіль, дзе-нідзе яно замшэла або падгніло. І сапраўды, прыгледзеўшыся, няцяжка заўважыць, што старыя дошкі ўжо маюць зеленаватае адценне.

Не трэба быць спецыялістам, каб разумець: калі з дахам бяда — прапаў увесь будынак. Ды тут самы час прыгадаць вядомую ісціну: з пункту гледжання метадалогіі адным з важных параметраў аўтэнтычнасці помніка з’яўляецца матэрыял. Адпаведна, яго належыць захоўваць гэтак жа беражліва, як і вонкавы вобраз аб’екта спадчыны. Але ці магчыма гэта ў выпадку з драўлянымі помнікамі, ды яшчэ і ў нашым клімаце?

Замест адказу супрацоўнік музея-запаведніка **Зміцер Савельеў** дэманстрае мне купку толькі што знятай гонты. Цяжка адмаўляць відавочнае: яна хіба што ў печку прыдатная. Пасля таго, як прасохне ад вільгаці.

Адмысловец тут жа агаломшае: тыя старыя дошчачкі таксама не тое каб надта аўтэнтычныя. Яны з’явіліся падчас мінулай рэстаўрацыі, якая прайшла гадоў 30 таму, а на адной з пабудоў комплексу — і яшчэ пазней.

— Раней была такая завядзёнка: з тым разлікам бацька перакрываў хату пасля нараджэння сына, што калі ён пасталее, то перакрые яе нанова, — кажа архітэктар. — Дрэва — гэта матэрыял, які ад пачатку прадугледжвае хуткую замену, бо мае свой тэрмін прыдатнасці. Пагатоў на дах куды больш уздзейнічаюць атмасферныя ападкі, ніж на іншыя часткі канструкцыі. Хаця і яны таксама з часам патрабуюць замены.

Я запытаў, як жа вырашалі гэтыя пытанні ў мінулым. Выявілася, што ніяк:

— Жыццёвы цыкл такіх пабудоў не перавышае стагоддзя, на большы перыяд яны апрыёры не былі разлічаны. Але пакольскі сёння тыя ж млын, кузня, свіран ды хата завозніка маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, грамадства імкнецца зберагчы іх як мага даўжэй — бо ўсе разумеюць, што гэта частка нашай беларускай ідэнтычнасці. Таму мы выкарыстоўваем розныя метады і сродкі, каб працягнуць жыццё будынкаў.

БЕНЗАПІЛА ЦІ ДЗЕДАВА СЯКЕРА?

Зміцер Савельеў перакананы, што, калі захоўваецца першаснае аблічча драўлянага будынка, а пры рэстаўрацыі прымяняюцца адэкватныя матэрыялы і тэхналогіі, ён мае права лічыцца помнікам спадчыны — нават тады, калі ад арыгінала ніводнай дошчачкі не застанецца (а гэта рана ці позна здарыцца).

Зрэшты, і да тэхналогій не варта ставіцца надта рыгарыстычна. Ці можна, напрыклад, выкарыстоўваць падчас рэстаўрацыі электраінструмент? Вядома ж, сёння ніхто гэтага не забараняе, і хіба вялікія заўзятары (а яны сустракаюцца) будуць утрапёна дзяўбці палена дзедавай сякерай. Звычайна гэта адбываецца ў вольны ад працы час — і не столькі дзеля выніку, колькі дзеля задавальнення.

ХЛЕБ МУЗЕЙНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Ці можаце вы ўявіць, што нейкая банальная рэч — прыкладам, найбліжэйшы да дому супермаркет — з часам стане помнікам спадчыны і прыважным для турыстаў музеем? Хіба што не. Ды хто сёння ведае, куды прывядзе імклівы ход часу — і асабліва развіццё тэхналогій? Вось і той самы млын яшчэ зусім нядаўна (нават не стагоддзі, а літаральна дзесяцігоддзі таму!) быў звыклым для ўсіх аб’ектам інфраструктуры — як сёння той самы супермаркет або рэстаран з фаст-фудам.

Адпаведна, млыноў у Беларусі існавала — процьма. Сёння ж ёсць толькі адзін дзейны — вадзяны, у мястэчку Жодзішкі на Смаргоншчыне. Прычым ён быў адроджаны — стараннямі рупліўца, унука колішняга гаспадара. І працуе той млын па прызначэнні ўсяго дзве гадзіны на дзень. У астатні час служыць экскурсійным аб’ектам.

Дарэчы, як распавяла Ксенія Сямашка, да 1996 года паравы рухавік у Заслаўі таксама малоў муку. Больш за тое, дэманстрацыю вытворчасці прадугледжвала сама канцэпцыя этнаграфічнага комплексу як жывога музея. Ужо ў тыя часы — звыш 30 гадоў назад! — там планавалася нават адкрыць такі нязвыклы для скансэнаў аб’ект, як уласная пякарня з крамкай, дзе прадавалі б свежы “музейны” хлеб.

З пякарняй тады не атрымлівалася. А неўзабаве і жорны спыніліся: узніклі непаладкі ў складаных механізмах, ды і патрабаванні пажарнай бяспекі на аб’екце выконваць было б вельмі цяжка.

Зрэшты, этнаграфічны комплекс усё адно захоўвае каларыт даўніны — толькі іншымі сродкамі. Уявіць, як рабілася мука ў прамінулую эпоху, дазваляе захапляльны аповед экскурсавода. А зайшоўшы ў хату завозніка — у своеасаблівы заезны дом для кліентаў млына — адчуваеш, нібы тыя самыя завознікі зусім нядаўна яе пакінулі.

Пабудову асвятляюць старадаўнія ліхтары-газніцы, у якія замест кнота ўстаўлены электрычныя лямпачкі (не надта прыкметныя, калі не ўзірацца). І гэта выглядае як трапная метафара...

— Зразумела, тут мы не можам абысці ўвагай такую тэму, як інтэрпрэтацыя спадчыны, яе адаптацыя да ўмоў сучаснасці, — кажа Зміцер Савельеў. — У дадзеным выпадку вытворчы аб’ект стаў музеем. Значыць, належыць адпаведным чынам дбаць пра бяспеку і камфорт наведвальнікаў. У сапраўдных млынах з гэтым, дарэчы, была праблема...

— Калі мы адаптуем да музейных патрэб гістарычны будынак, дык павінны думаць пра электрычнасць, ацяпленне і пра тое, каб не было лішніх пахаў, — уключаецца ў размову Ксенія Сямашка. — Лічу, цалкам прымальна, калі рэканструкцыя робіцца з улікам запытаў сучаснага чалавека. Мы мусім разумець, што нават менталітэт сёння іншы. Раней памол мукі доўжыўся 10 гадзін — і людзі трывалі, ніхто не скардзіўся. Цяпер жа, калі тэкст большы за старонку, многія стамляюцца яго чытаць.

Але ж немінуча ўзнікае пытанне: ці не з’яўляецца такі падыход падменай аўтэнтыкі?

— Так, без падмены ніяк не абысціся, — пагаджаецца суразмоўца. — Тыя традыцыйныя святы, якія мы ладзім, — гэта ж таксама рэканструкцыя ў адаптаваным выглядзе. Даўно заўважыла: наведвальнік не разумее рэалій мінулага, калі іх не перакласці на сучасную мову — што цудоўна ўмеюць нашы харызматычныя экскурсаводы. Менавіта далікатная адаптацыя спадчыны здольная наблізіць яе да сучасніка. Чалавек захапляецца мінулым тады, калі мы малюем паралелі з сучаснасцю — і, вядома, калі ён уключаны ў інтэрактыўны працэс.

Сёння новыя элементы даху старых будынкаў выразна вылучаюцца на агульным фоне. Ды Зміцер Савельеў запэўнівае: праз некалькі гадоў дранка пацямнее і будзе належна стварыць эфект даўніны. А як пройдзе пара-тройка дзесяцігоддзяў, пакрыццё зноў давядзецца мяняць.

— Адзіны спосаб гэтага пазбегнуць — замяніць дрэва на які-небудзь іншы матэрыял, сучасны і больш трывалы, — дадае адмысловец. — Ды лішне нават казаць, што такі варыянт не разглядаецца.

...Што ж, выснова, у рэшце рэшт, відавочная: спадчына — гэта найперш пра людзей, а не пра дрэва.

Ілья СВІРЫН
Фота Генадзя СІВОХІНА

Тут песня ніколі не сціхне

Ці можа каманда з трох супрацоўнікаў ладзіць брэндавыя імпрэзы і скараць міжнародныя конкурсы? Лёгка — калі гэтым людзям наканавана займацца творчасцю. Тады знойдуцца аднадумцы, тады адмыслоўцаў акрыліць глядацкая любоў. Сведчыць пра гэта вопыт маленькага калектыву рупліўцаў Валкалацкага сельскага дома культуры, што ў Докшыцкім раёне, на чале з Марыяй Кімстач.

Уладзімір Чыкун, Таццяна Ляпкова, Вольга Сушко, Марыя Кімстач, Яўген Кімстач

Марыя Чаславаўна прызнаецца, што творчасць вабіла яе з маленства. Душа прасілася на сцэну. Верагодна, любоў да музыкі перадалася ад родных. Тата быў акардэаністам-самавукам, і яго здольнасцям дзівілася ўся ваколіца. "Так прыгожа і выразна, як Часлаў, ніхто не іграе", — казалі людзі. Бацькава ж сястра валодала цудоўным голасам. Спявачцы нават прапаноўвалі пачаць прафесійную кар'еру, аднак цётка мусіла застацца пры сям'і і гаспадарцы. Усё жыццё выканаўца адпрацавала ў мясцовым клубе — і літаральна за руку прывяла на сцэну пляменніцу Марыю.

Дзяўчына ж, нягледзячы на захапленне вакалам, адразу пайшла ў іншую прафесію: паслухалася настаўніцу, што параіла абраць больш даходную спецыяльнасць, ды паступіла ў эканамічны ўніверсітэт. Але ў рэшце рэшт стала культработнікам — з 2004-га працуе ў Валкалацкім сельскім доме культуры.

Брат Марыі Чаславаўны таксама пераняў здольнасці ад родзічаў. Уладзімір Чыкун атрымаў музычна-педагагічную адукацыю і ўжо больш за 30 гадоў шчыруе ў сферы культуры. Менавіта ён быў ля вытокаў ансамбля "Прызбачка", у якім да гэтага часу выконвае абавязкі хормайстра і акампаніятара. Іншыя ўдзельнікі калектыву спецыяльнай падрыхтоўкі не праходзілі, затое ад прыроды маюць добры слых і мілагучны голас, як мастацкая кіраўніца і салістка Таццяна Ляпкова.

Паўстаў гурт у 2001 годзе, а найменне "Народны" атрымаў у 2010-м. Рэпертуар калектыву надзвычай багаты, але найбольшую ўвагу самадзейныя артысты надаюць беларускай народнай песні. Шэраг твораў запісалі ад мясцовых носьбітаў традыцыйнай культуры. І вакальнай музыкай набытак ансамбля не абмяжоўваецца: ад пачатку суполка ставіла своеасаблівыя шоу, у якіх песні чаргуюцца з харэаграфічнымі замалёўкамі і жартамі. За тое і палюбілі "Прызбачку" шматлікія гледачы. Дарэчы, калектыў вядомы не толькі ў сваім аграгарадку. Выступоўцы бывалі за мяжой, аб'ехалі нямала гарадоў ды мястэчак у Беларусі. Скарылі валкалацкія артысты і сталіцу "Славянскага базару". Ужо колькі гадоў падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў у Віцебску ладзіцца турнір нацыянальных танцаў "Танчым разам".

Пад адным дахам сабралася суполка адданых творчасці людзей — і таму не выпадае сумнявацца, што ў Валкалаце песні не заціхнуць.

Свята агурка — новы культурны брэнд Валкалатаў

Творчыя калектывы Валкалацкага сельскага дома культуры

Сёлета Марыя і Яўген Кімстач ды Уладзімір Чыкун з Таццянай Ляпковай сталі пераможцамі гэтага спаборніцтва.

Славутасць Валкалаты — касцёл Яна Хрысціцеля. Ён быў асвечаны ў 1885 годзе і ніколі не закрываўся. Сёння помнік архітэктуры ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. У храме захоўваецца абраз Святога Роха. І мясцовыя жыхары здаўна шанавалі гэтага апекуна вандроўнікаў, хворых і лекараў.

Да дня памяці святога Роха ў жніўні прымеркаваны традыцыйны Валкалацкі фэст, на які звычайна прыязджае нямала гасцей. Пасля імшы ў касцёле вясёлоўцаў чакаюць выставы, усялякія забавы і пачастункі ад тутэйшых гаспадынь. Найважнейшая частка свята — канцэрты духоўнай музыкі. І тут рэй вядуць удзельнікі аматарскага аб'яднання "Голас душы" пры сельскім Доме культуры. Яны развучваюць рэлігійныя творы, выконваюць іх у храме, а таксама збіраюцца паразважаць аб вечных каштоўнасцях. Варта дадаць, што кіраўніца СДК Марыя Кімстач сама спявае ў касцельным хоры, а Уладзімір Чыкун іграе на аргане.

Сёлета ў Валкалаце ўпершыню зладзілі свята агурка. Падзея мусіць стаць яшчэ адным культурным брэндам аграгарадка. На новы фэст з'ехаліся госці з усіх ваколіц — з добрымі песнямі і, вядома, пачастункамі. Установы культуры і іншыя арганізацыі раёна прэзентавалі арыгінальныя стравы. Аздобілі праграму выступленнямі і мясцовыя самадзейныя артысты. А пары з розных куткоў Докшыцкай зямлі сышліся ў харэаграфічным спаборніцтве — турніры беларускіх народных побытавых танцаў. У скокі пусціліся нават старажылы. Самай вопытнай канкурсантцы споўнілася 80 гадоў!

Кіраўніца СДК Марыя Кімстач дзеліцца: "Мне пашанцавала з камандай — супрацоўнікамі і ўдзельнікамі аб'яднанняў". Пад адным дахам сабралася суполка адданых творчасці людзей — і таму не выпадае сумнявацца, што ў Валкалаце песні не заціхнуць. Прыжывуцца новыя традыцыі, не згінуць даўнія.

Даніл ШЭЙКА
Фота з архіва ўстановы

Ствараючы прыгажосць жыцця

Віцебскі ансамбль "На ростанях" — адносна малады калектыў. Ён існуе крыху больш за 15 гадоў, але ўжо мае званні "Народны аматарскі калектыў" і "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь". Пастаянная прапіска — у паўночнай сталіцы, аднак з канцэртамі і гастролямі артысты аб'ехалі шмат замежных гарадоў.

У жыцці здараюцца хвіліны, калі чалавек стаіць перад выбарам. І творчасць дапамагае знайсці аптымальнае рашэнне. Яна настройвае на пазітыў, лічаць у віцебскім ансамблі "На ростанях". Члены калектыву — маладыя людзі, навучэнцы каледжа культуры і мастацтваў, якія яшчэ знаходзяцца на ростанях. Адны, заканчваючы вучобу, усё жыццё прысвячаюць мастацтву, хтосьці спрабуе шукаць сябе ў іншай прафесіі, але працягвае рэалізоўваць свае здольнасці ў мастацкіх калектывах. Час, праведзены ў "На ростанях", — перыяд фармавання характару юнакоў і дзяўчат, выхавання мэтанакіраванасці і працавітасці.

За гады існавання колькасць удзельнікаў павялічылася з 12 да 33, узрост — ад 15 да 25 гадоў. Ансамбль уключае некалькі груп: асноўны склад — старэйшыя курсы, падрыхтоўчая група — першакурснікі. На занятках яны працуюць над манерай выканання нумароў, пластычнасцю, сінхроннасцю, удасканальваюць тэхніку і майстэрства.

Ідзе работа над хуткасцю выканання рухаў і камбінацый, над правільнасцю падачы танцавальных нумароў на сцэне, вывучаецца мужчынская і жаночая тэхнікі, вярчэнні, падтрымкі. Аснова, на якой трымаецца "На ростанях", — калектывізм і добразычлівыя адносіны, пачуццё адказнасці за агульную справу, здольнасць успрымаць і ствараць прыгожае. Удзельнікі калектыву не проста выканаўцы, але і аднадумцы, якія прапануюць свае рашэнні, сваё бачанне танцавальных нумароў.

У рэпертуары — танцы мэтраў харэаграфічнага мастацтва Івана Серыкава, Леаніда Барадулькі, пастаноўкі кіраўніка ансамбля Сяргея Ракоўскага, які ў сваёй творчасці абапіраецца на народныя вытокі, пераносячы іх у дзень сённяшні. Мастацтва харэаграфіі патрабуе вялікіх намаганняў. "На ростанях" ужо не раз даказваў сваё майстэрства. На фестывалях заўсёды заваёўвае мінімум другое месца, а часцей за ўсё першае.

У 2020 годзе ансамбль быў запрошаны на ўрачыстыя мерапрыемствы да Дня Незалежнасці ў Мінск і ў Маскву на адкрыццё грамадска-культурных і спартыўных мерапрыемстваў II Еўрапейскіх гульняў. У 2021-м удзельнічаў у канцэртнай праграме на Усебеларускім народным сходзе. Праз год выступаў на Усерасійскім музычным фестывалі імя М.І. Глінкі ў Ельні, у культурных мерапрыемствах Дзён Віцебскай вобласці ў Пскове, у міжнароднай сустрэчы дэлегацый Беларусі, Расіі і Латвіі на Кургане Дружбы (Верхнядзвінскі раён).

"На ростанях" — адзіны запрошаны калектыў з Рэспублікі Беларусь, які прыняў удзел ва ўрачыстым закрыцці рэалізацыі Міждзяржаўнай праграмы "Каракол — культурная сталіца Садружнасці 2022 года" ў Кыргызстане.

Ансамбль "На ростанях" — маладыя, мэтанакіраваны калектыў, які здабыў прафесійнае прызнанне і мае вялізны стваральны патэнцыял. Ён з натхненнем і надзеяй глядзіць у будучыню: заўсёды ў творчым пошуку, з новымі цікавымі праектамі і планамі на далейшую гастрольную дзейнасць. Хлопцы і дзяўчаты ведаюць, чаго хочуць дабіцца ў свеце танца. І галоўнае — гэтыя артысты кожны дзень растуць над сабой, становячыся мацнейшымі і больш прафесійнымі.

Ганна САКАЛОВА
Фота з архіва калектыву

У тэатр разам з "Культурай"

Ужо месяц у Telegram-канале "Культура і мастацтва" праходзяць віктарыны, якія мы ладзім сумесна з Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь. І вось новая порцыя захопленых водгукаў ад пераможцаў!

Дзяніс Максімовіч з дзяўчынай

Кожны панядзелак у месенджары з'яўляецца восем пытанняў па апошнім нумары газеты "Культура". Хто здольвае першым на іх адказаць і дасласць правільныя варыянты, атрымлівае два квіткі ў Вялікі.

Дзяніс Максімовіч даведаўся пра нашае выданне ад сваёй дзяўчыны і разам з ёй разгадаў віктарыну. Пераможца працуе ў кампаніі, якая займаецца дапоўненай рэальнасцю, таму часта звязаны з музейнай і мастацкай дзейнасцю. Аднак жаданне наведаць Вялікі тэатр і ўбачыць пастаноўку на свае вочы ў Дзяніса было даўно. Дзякуючы ўдзелу ў нашай пазнавальнай гульні мінчанін здзейсніў сваю мару і наведаў оперу "Тоска":

— Сюжэт пастаноўкі захапіў адразу, — дзеліцца ўражаннямі Дзяніс. — Італьянскія страсці ярка раскрылі тэмы кахання і нянавісці, высакароднасці і здрады. Уразіла дынамічная, тэмпераментная ігра акцёраў, а таксама іх выдатныя, хваслюючыя галасы ў спалучэнні з узрушальнай струменістай музыкай у выкананні жывога аркестра. Прывабілі дэкарацыі і касцюмы, стылізаваныя пад эпоху падзей. Адзначу, што спектакль успрымаецца на адным дыханні, нягледзячы на тры акты. Раю ўсім наведаць оперу "Тоска". Яркія эмоцыі забяспечаны!

Галіна Кішэня, супрацоўніца Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца даўняй і сталай чытачкай газеты "Культура", таму змагла справіцца нават з самымі складанымі пытаннямі.

Разам з мужам Галіна наведала оперу "Моцарт і Сальеры" і падзялілася станоўчымі эмоцыямі пасля прагляду:

— Дзякуй за магчымасць паўдзельнічаць у конкурсе і атрымаць квіткі ў Вялікі. Мы не толькі засталіся ў задавальненні ад оперы, але яшчэ ацанілі размешчаную ў холе экспазіцыю старых фатаграфій і паштовак з выявай тэатра ў розныя перыяды. Нядзельны вечар быў афарбаваны самымі яркімі колерамі.

Галіна Кішэня

Цыкл віктарын у нашым Telegram-канале працягваецца. Ужо ў гэты панядзелак, 11 снежня, вы зможаце праверыць свае веды па № 48 газеты "Культура" і трапіць на оперу "Іаланта" ў Вялікім тэатры!

"Крытая Брама" — арыенцір

З пакалення пачынальнікаў

Як суботнік перарос у нешта большае

Сённяшні расповед мы прысвячаем пісьменніку Альгерду Абуховічу (1840—1898), сучасніку і аднадумцу слынных беларускіх літаратараў, шмат у чым першапраходцаў — Францішка Багушэвіча, Ядвігіна Ш., Янкі Лучыны. Нагодай наведацца ў Слуцк, дзе Альгерд Абуховіч прабавіў канец жыцця (і дзе знайшоў вечны прытулак), сталі 125-я ўгодкі спачыну творцы.

Слуцк — адзін з найстарэйшых гарадоў Беларусі. Не дзіва, што за амаль тысячагадовую гісторыю ён стаў арэнай важных падзей і домам вялікай колькасці славутых айчынных дзеячаў. Слуцк ёсць радзімай сусветна вядомага брэнда — адмысловых паясоў, брэнда рэспубліканскага — "Слуцкі цукар". Густоўныя ўпакоўкі з блакітнымі валошкамі можна знайсці хіба не ў кожнай краме. Што казаць — Слуцк, культурную сталіцу Беларусі – 2023, ведаюць усе.

ДА СПРАВЫ

Так павялося, што кожны візіт у гэты горад я пачынаю не ў музеях ці кавярні, а на вуліцы 14 Партызан, на старых могілках. Яны знаходзяцца на ўездзе ў Слуцк з боку Мінска, таму ім і першы знак увагі. Стагоддзямі тут аддавалі зямлі сялян, месцічаў, шляхту самых розных веравызнанняў — каталікоў, праваслаўных, пратэстантаў, іўдзеяў. Строгі падзел на сваіх і чужых, што існаваў у ранейшыя часы, даўно парушаны, як і сістэмнасць пахавання. Традыцыйна для старых могілак — шмат перакуленых і напаўзасыпаных помнікаў. Каля 80 гадоў няма тут касцёла і царквы, засталася толькі іх равесніца, цудам ацалелая, — мураваная брама. Менавіта да яе адразу і прастуем. Злева, за сціплай старой блакітнай агароджай, — пахаванне Графа Бандынэлі (псеўданім Альгерда Абуховіча). Працы тут заўсёды хапае. Адправіўшы на сметнік пару важкіх мяхоў зеляніны, я зацепліў зніч і агледзеўся. Агароджу апошні раз фарбавалі некалькі гадоў таму, і яна патрабуе паднаўлення. Тое самае тычыцца надпісу на камені: расчытаць тэкст непроста. Ні ў гэты момант недзе на "гарышчы" абудзіўся мой унутраны папулярызатар, а за ім у "сутарэннях" — і даследчык. Першы прагукаў: "Як даць знаць мінакам, што тут спіць вечным сном выдатны сын Беларусі?" Мінакоў жа (у самым прамым сэнсе) каля Абуховічавага пахавання штодня — сотні: яго ад ходніка аддзяляе метр зямлі і невысокая агароджа могілак. І размова толькі пра гараджан. А колькі бывае турыстаў у сезон? Пытанне ўсім нам.

Даследчык жа прагудзеў басам: "Правер на цікавінкі жыццярыс і радавод". Гэтым я і заняўся, вярнуўшыся дадому. І сёе-тое знайшлося. Папершае, зусім іншымі фарбамі зайграла біяграфія пісьменніка, раней вядомая мне фрагментарна. Па-другое, адкрыліся патаемныя хады да такіх адметнасцей радаводу (у ім задзейнічаны паэт Адам Міцкевіч, філосаф Фларыян Бохвіц і "электрычны чалавек" Якуб Наркевіч-Ёдка), што не падзяліцца імі проста немагчыма. І мы зробім гэта ў асобнай публікацыі.

УНЁСАК У СКАРБНІЦУ

Да 180-годдзя з дня нараджэння Альгерда Абуховіча навукова-даследчы аддзел бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі падрыхтаваў даведку пра пісьменніка. Звернемся да яе.

У гісторыю беларускай літаратуры Альгерд Рышардавіч Абуховіч (6 жніўня 1840 — 22 жніўня 1898) увайшоў як паэт, пісьменнік-рэаліст, перакладчык, адзін з пачынальнікаў жанру байкі, мастацкай прозы і мемуарыстыкі.

Нарадзіўся Альгерд Рышардавіч у маёнтку Калаціўы Бабруйскага павета Мінскай губерні (цяпер Глускі раён Магілёўскай вобласці)... Найбольш ярка талент А. Абуховіча праявіўся ў напісанні баек. Характэрна, што для сваіх твораў літаратар абраў менавіта беларускую мову. На жаль, пры жыцці А. Абуховіча яго байкі не друкаваліся. Да нашага часу дайшлі толькі некаторыя з іх ("Ваўкалак", "Старшына", "Суд", "Воўк і лісіца"). Асобае месца ў творчасці пісьменніка займаюць мемуары (1894), якія вызначаюцца цікавым зместам, каларытнасцю замалёвак, народнай мовай, свабоднай формай апавядання, выяўляюць глыбокую сувязь з народнай культурай. У творы адлюстраваны многія бакі тагачаснага жыцця. Фрагменты мемуараў былі надрукаваны ў 1916-м у віленскай газеце Homan. Дзякуючы глыбокаму веданню замежнай культуры і літаратуры, бліскучаму валоданню асноўнымі еўрапейскімі мовамі А. Абуховіч стаў сапраўдным майстрам мастацкага перакладу. Літаратар увасабляў на беларускай мове спадчыну І. В. Гётэ, Ф. Шылера, В. Гюго, Дж. Байрана, Д. Аліг'еры, А. С. Пушкіна, М. Ю. Лермантава, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, М. Канапніцкай і іншых (пераклады распаўсюджваліся ў рукапісах). На думку Р. Родчанкі, даследчыка жыцця і творчасці А. Абуховіча, пасля смерці пісьменніка яго рукапісы, архіў, шматлікія кнігі з асабістай бібліятэкі або спаліў, або здаў у макулатуру. Асобныя рукапісы-аўтографы знаходзяцца ў замежных бібліятэках.

ВЯРТАННЕ

Згаданы Р. Родчанка — гэта чалавек, якому Альгерд Абуховіч фактычна абавязаны вяртаннем з небыцця. Рыгор Родчанка (1929—1994) — беларускі краязнавец, літаратуразнавец, фальклярыст, пісьменнік і педагог. Яго дзяцінства прыйшлося на часы нямецкай акупацыі Беларусі. З 1942-га ваяваў у партызанскім атрадзе імя А. В. Суворава. У тым жа годзе пры выкананні задання атрымаў цяжкае раненне. Улетку 1943-га быў уключаны ў ініцыятыўную групу па стварэнні партызанскага атрада імя К. К. Ракасоўскага. Падраздзяленне ўвайшло ў склад 95-й партызанскай брыгады імя М. В. Фрунзэ.

Скончыў БДУ. У 1959 годзе вярнуўся ў Слуцк і пачаў працаваць настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Менавіта тады і зацікавіўся асобай земляка — Альгерда Абуховіча. Тую апантанасць Родчанка пранёс праз усё жыццё. Пляечнікам знаўцы ў яго пошуку, натхняльнікам і сябрам стаў ураджэнец Слуцка знакаміты пісьменнік Язэп Дыла (1880 — Саратаў, 1973), колішні вучань Альгерда Абуховіча. Ва ўспамінах Дылы ёсць такія радкі: "А вечарам таго дня... мы мелі госцем гэтага «дзівака» і слухалі яго, Альгерда Абуховіча, вершы на беларускай мове, пераважна байкі. У іх пісьменнік умела, у трапных выразах і словах высмейваў паноў і падпанкаў, заможных сялян і фанабэрыстых шляхцюкоў, ксяндзоў і царскіх «чынадралаў»... Бацька з маткаю з захапленнем слухалі яго творы і часта дружна смяяліся. Я сядзеў і слухаў як зачараваны, бо ўпершыню з вуснаў пана, хаця і ў паношанай вопратцы, прытым ад чалавека ўжо са срэбрам у валасах, чуў «дзіва» — мілагучныя вершы на той мове, якой я, жывучы да дзевяці гадоў у сям'і дзеда і бабкі, карыстаўся, якую я лічыў прыгожай і якую я ў гімназіі бараніў перад аднакласнікамі, што яе ганілі і высмейвалі. Пісьменнік у маіх вачах цяпер паўставаў як абаронца мовы свайго народа, як вястун і чараўнік роднага слова". Дарэчы, Рыгор Родчанка — аўтар вялікай колькасці публікацый па краязнаўстве і кніг "Альгерд Абуховіч-Бандынэлі: нарыс жыцця і творчасці" (1984), "Альгерд Абуховіч. Творы" (1991), "Старэйшая школа Беларусі" (1985) і "Слуцкая старасветчына" (1991).

МАГІЛА І ЯЕ ПОШУКІ

Ліставанне паміж двума землякамі Абуховіча было вельмі плённым. Дзякуючы дапамозе Дылы і знайшлася магіла Альгерда Абуховіча, якая лічылася страчанай у ваенныя часы. У адказ на пытанне Рыгора Родчанкі, дзе яна знаходзіцца, Язэп Дыла распавёў цэлую гісторыю. У 1920 годзе ён, тады яшчэ студэнт, пабываў на радзіме і адшукаў на могілках пахаванне былога настаўніка. Пазней, ужо жывучы ў Саратаве, у 1950-х, літаратар звярнуўся да слуцкіх камсамольцаў з просьбай знайсці і ўзяць пад ахову магілу Абуховіча. Тыя паабяцалі, але не справіліся, хоць Дыла даваў вельмі дакладныя каардынаты: першы рад пахаванняў, чацвёртая магіла з левага боку, калі ісці на могілкі праз "Крытую Браму" ў напрамку да касцёла. Творца прасіў далучыцца і сваю сястру, але старая жанчына напісала ў адказ, што ў час гаспадарання нямецка-фашысцкіх акупантаў пахаванне Абуховіча-Бандынэлі разбурылі. Атрымаўшы ад Дылы ўказанні, у якім кірунку шукаць, Родчанка разам з краязнаўцам Вікенціем Дунаеўскім выправіліся ў экспедыцыю. Іх высілкі далі плён. На адным камені з-пад моху паказаліся літары з сям-там бачнай пазалотай. Тэкст на польскай мове сведчыў: "Тут спачывае цела с. п. Альгерда Абуховіча. Пам. 10 жн. 1898 г. Вечны спакой яго душы" (дата па старым стылі). Не веручы ўласным вачам, даследчыкі запрасілі жанчыну, якая добра чытала па-польску. Яна ўбачыла тое самае. Адзінае бянтэжыла Родчанку — дата смерці: не каля 1905-га (так сцвярджалі энцыклапедыі), а канкрэтны 1898 год. Дэшыфраваўшы надпіс на помніку, Родчанка прывёў вартаўніка могілак і яго жонку да месца, дзе пахаваны А. Абуховіч, і сказаў ім прыкладна наступнае: "Тут спачывае вялікі беларускі пісьменнік. Але пра яго яшчэ мала хто што ведае. Усе мы смертныя. Магу раптоўна сысці і я, і тады магіла ізноў згубіцца. Трымайце яе пад аховаю. Ёй яшчэ будуць цікавіцца вучоныя, і не толькі яны..." Неўзабаве пра сенсацыйную знаходку дазналіся чытачы "ЛіМа" і слуцкай газеты "Шлях Ільіча". У лісце ад 6 лістапада 1966-га Язэп Дыла павіншаваў Рыгора Родчанку: "Наколькі я бясконца рады, што нарэшце Вы знайшлі магілу нашага незабыўнага А. Абуховіча, можа сведчыць тое, што, калі б Вы самі прыйшлі да мяне з гэтай радаснай весткаю, я схапіў бы Вас у абдымкі, стакроць пацалаваў бы, даражэнькі сябра, моцна ціснучы да свайго старога сэрца".

Міхаіл Вецік. Партрэт Альгерда Абуховіча

Рыгор Родчанка

Язэп Дыла

КАНФЛІКТ ІНТАРЭСАЎ

Ніхто не адмаўляў каштоўнасці гэтай знаходкі. З'явіліся апаненты з боку навукоўцаў толькі адносна даты скону. Раптам высветлілася, што яшчэ Яўхім Карскі ў працы "Беларусы" падаваў праўдзівыя гады жыцця Альгерда Абуховіча (1840—1898). Некаторыя даследчыкі ўпарта сталі адстойваць памылковы 1905-ы. Сёння цяжка ўявіць, што гэтая спрэчка расцягнулася аж на 10 (!) гадоў. Каб перакананца, што Родчанка меў рацыю, у Слуцк нават адправіліся навуковыя супрацоўнікі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук. Упэўніўшыся, што краязнаўца ні ў чым не памыліўся, яны прынялі яго бок. Тое самае зрабілі і іншыя скептыкі. Дарэчы, магілу пісьменніка паказала навукоўцам згаданая жонка вартаўніка.

НІБЫ ТАСТАМЕНТ

У апошніх лістах Язэпа Дылы да Рыгора Родчанкі ёсць такія словы: "Бласлаўляю Вас прыняць на сябе ініцыятыву... 1) прывесці ў належны выгляд магілу А. Абуховіча; 2) звярнуцца да ўстаноў Беларусі і грамадства па дапамогу ў адшуканні рукапісаў і твораў гэтага аўтара, каб выдаць поўны збор яго баек і іншай спадчыны на беларускай мове", "Лічу, што трэба яшчэ, каб Слуцкі выканкам дапамог у захаванні доміка Хведаровічаў на Іваналўскай вуліцы (гэты дом згарэў. — *Р. Р.*; сёння вуліца Розы Люксембург. — *З. Ю.*) і перайменаванні яе ў вуліцу імя А. Абуховіча". У 1984 годзе Родчанка падсумаваў дасягнутае: "У чытача можа ўзнікнуць пытанне: што зроблена па гэтых лістах пісьменніка? Адказваю. Над магілаю Абуховіча-Бандынэлі шэфствуюць дзве арганізацыі Слуцка. Пахаванне дагледжана, прыбрана, своечасова фарбуецца агародка. У дні рэвалюцыйных свят на магілу ўскладаюцца вянкі". Рыгор Родчанка, як мы ўжо ведаем, выканаў і яшчэ адзін запавет — выдаць збор твораў Абуховіча (1991).

Раней месца пахавання пісьменніка не толькі даглядалася, але і афіцыйна мела пэўны статус. Пра гэта сведчыць важкі том "Збор помнікаў гісторыі і культуры. Мінская вобласць" (1987). Аднак цяпер у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей магіла чамусьці адсутнічае. Улічваючы важнасць асобы Альгерда Абуховіча, можна паставіць пытанне аб вяртанні пахаванню ахоўнага статусу.

Яго, напрыклад, маюць магілы Францішка Багушэвіча ў Жупранах і Паўлюка Багрыма ў Крошыне (у паселішчы гэты паэт увогуле культавая асоба: адной вуліцы нададзена яго імя, а на месцах, дзе знаходзіліся дом і кузня творцы, ёсць адпаведныя знакі). Дарэчы, у Слуцку памяць Альгерда Абуховіча ўжо ўшанавана ў назвах вуліцы і праезда ў мікрараёне Навадворцы. Лагічным падаецца такі маленькі для Слуцка, але важны для Беларусі крок.

P. S. Ёсць яшчэ адно важнае сведчанне таго, што памяць аб славутым пісьменніку жыве. У аграгарадку Калаціўы (Глускі раён) каля сельскага Дома культуры ўсталяваны памятны знак у гонар Альгерда Абуховіча.

Зміцер ЮРКЕВІЧ
Фота аўтара і з архіваў

Магіла Альгерда Абуховіча (было/стала)

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года

Газета "Культура"

Індывідуальны **63875** 1 мес. – 15,02 руб., 3 мес. – 45,06 руб., 6 мес. – 90,12 руб.

Ільготны ведамасны **638722** 6 мес. – 129,30 руб.

Ведамасны **638752** 1 мес. – 24,87 руб., 3 мес. – 74,61 руб., 6 мес. – 149,22 руб.

Індывідуальны льготны **63872** 6 мес. – 78,64 руб.

Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску на адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў) **63879** 1 мес. – 16,96 руб., 3 мес. – 50,88 руб., 6 мес. – 101,76 руб.

Газета "Культура" + часопіс "Мастацтва". Камплект

Індывідуальны **63874** 1 мес. – 31,94 руб., 3 мес. – 95,82 руб., 6 мес. – 191,64 руб.

Ведамасны **638742** 1 мес. – 58,19 руб., 3 мес. – 174,57 руб., 6 мес. – 349,14 руб.

Часопіс "Мастацтва"

Індывідуальны **74958** 1 мес. – 20,11 руб., 3 мес. – 60,33 руб., 6 мес. – 120,66 руб.

Ільготны ведамасны **749412** 6 мес. – 202,21 руб.

Ведамасны **749582** 1 мес. – 39,45 руб., 3 мес. – 118,35 руб., 6 мес. – 236,70 руб.

Індывідуальны льготны **74941** 6 мес. – 103,40 руб.

Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску на адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў) **74986** 1 мес. – 22,21 руб., 3 мес. – 66,63 руб., 6 мес. – 133,26 руб.

Афіша з 8 па 15 снежня

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава **"Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм". Да 11 снежня.**
- Рэтраспектыўная выстава дыпломных работ выхаванцаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **"Школа творчасці"**. У экспазіцыі дэманструецца каля 50 жывапісных, скульптурных і графічных прац з фондаў акадэміі ды збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. **Да 17 снежня.**
- Выстава **"Нашы калекцыі. Французскае выяўленчае мастацтва са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь". Да 15 студзеня 2024 года.**
- Выстава **"Апалінарый Гараўскі. Да 190-годдзя з дня нараджэння". Да 28 студзеня 2024 года.**
- Выстава **"«...На гонар і на хвалу Госпаду Богу...». Датаваныя і падпісныя творы сакральнага мастацтва Беларусі XVI—XIX ст.". Да 28 студзеня 2024 года.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Віды і жанры ў выяўленчым мастацтве" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Тэматычная праграма **"Раство ў Ваньковічаў"** з майстар-класам па вырабе навагодніх цацак. **Да 13 студзеня 2024 года.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Зборная інтэрактыўная праграма **"Мова веера". Праводзіцца заўсёды.**
- Праграма **"У свяцліўшы, дзе дыхае цень алівы". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА
Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іваналўская, 176, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава майстроў народных мастацкіх рамёстваў Дзяржынскага раёна **"У родным краі як у раі". Да 8 снежня.**
- **Калядны канцэрт** інструментальнага ансамбля **ANIMA** Бараўлянскай дзіцячай школы мастацтваў. **17 снежня.**
- Выстава з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
- Майстар-клас **"Саломапляценне". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-мотанка". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ
г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаздымкаў беларускіх творцаў XX–XXI стст. з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь **"Калі мы былі дзецьмі". Да 17 снежня.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by**.

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: mdrama.by

• Меладрама **"Яшчэ раз пра каханне" (16+)**. Гастролі Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. **8 снежня ў 18.30.**
• Казка-фантастыка ў 1 дзеі **"Іншапланецяня" (0+)**. **9 снежня ў 12.00.**
• Камедыя ў 1 дзеі **"Настаўленне для ахвотных ажаніцца" (16+). 9 снежня ў 18.30.**
• Чароўная казка **"Марозка" (3+). 10 снежня ў 12.00.**
• Трагедыя па матывах камедыі **"Дон Жуан" (16+)**. Прэм'ера. **10 снежня ў 18.30.**
• Казка **"Снежная каралева" (6+). 14 снежня ў 11.00, 15 снежня ў 11.00, 16 снежня ў 11.00, 17 снежня ў 14.00.**
• Памылка доступу ў 1 дзеі **"Гэта ўсё яна" (18+). 14 снежня ў 18.30.**
• Канцэрт ансамбля Expromt-Klassika-Quartett у 1 дзеі **"Рамантыка#Love" (16+). 15 снежня ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар" (12+)**. Галоўная сцэна. **8 снежня ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"Музыка душы" (0+)**. Камінная зала. **9 снежня ў 19.00.**
• Трагікамедыя ў 2 дзеях па матывах твора У. Шэкспіра **"Рамэа і Джульета" (12+)**. Галоўная сцэна. **10 снежня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Чакана гучна і да болю блізка" (16+)**. Камерная сцэна. **12 снежня ў 19.00.**
• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **"Чорная панна Нясвіжа" (12+)**. Галоўная сцэна. **13 снежня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+)**. Галоўная сцэна. **14 снежня ў 19.00.**
• Спектакль **"Двор майго дзяцінства" (6+)**. Прэм'ера. Камерная сцэна. **16 снежня ў 19.00.**
• Моднае мерапрыемства **VUCA Fashion Art (0+)**. Галоўная сцэна. **17 снежня ў 13.30, 19.30.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• **Канцэрт лаўрэатаў XVII Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага (12+).** Да 24-й гадавіны стварэння Саюзнай дзяржавы. **8 снежня ў 18.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Іаланта" (6+)**. Прэм'ера. У межах XIII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму. **10 снежня ў 18.00.**
• Опера ў 3 дзеях **"Шукальнікі жэмчугу" (12+)**. Спектакль Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Узбекістана імя А. Наваі. У межах XIII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму. **12 снежня ў 19.00.**
• Камічная опера ў 2 дзеях **"Севільскі цырульнік" (12+)**. Прэм'ера. У межах XIII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму. **13 снежня ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Любоў да трох апельсінаў" (12+)**. Спектакль Самарскага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя Д. Д. Шастаковіча. У межах XIII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму. **14 снежня ў 19.00.**
• Канцэрт **"Край прыгожых людзей" (12+)**. Вечары з "Серэнадай". Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **14 снежня ў 19.30.**
• Гала-канцэрт зорак опернай сцэны **Viva Opera! (12+)**. У межах XIII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму. **15 снежня ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Ілюзіі кахання" (16+)**. Прэм'ера. **16 снежня ў 18.00.**

УНП 191081322

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Часовая экспазіцыя Вольгі Старасцінай **"Звяжам свет прыгажосцю"**. Калекцыйная зала "Нумізматыка і фалерыстыка". **Да 21 студзеня 2024 года.**
• Выстава **"Упершыню экспанат. З фонду Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»"**, прысвечаная 30-годдзю ўстановы і 800-годдзю горада Нясвіжа. Вялікая выставачная зала. **Да 9 студзеня 2024 года.**
• Часовая экспазіцыя **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 13 кастрычніка 2024 года.**
• Экспазіцыя **"Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені"**. Аўтар праекта А. В. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада 2024 года.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара". У складзе пастаяннай экспазіцыі.**

Мерапрыемствы
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры", "Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа", "Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Часовая экспазіцыя Андрэя Ждановіча **"Беларускі пейзаж"**. **Да 31 студзеня 2024 года.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стагоддзяў **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **"Выстава абразоў з фондаў Карэліцкага раённага краязнаўчага музея" (0+)**. Царква-пахавальня князёў Святаполк-Мірскіх. **Да 10 снежня.**
• Часовая экспазіцыя васковых фігур **"Тайная вячэра" (0+)**. **Да 10 снежня.**
• **Адкрыццё каляднага сезона** з князем і княгіняй пад гарматны стрэл і танец "Маразуля". **16 снежня ў 12.00.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Квэст-экскурсія для ўсёй сям'і **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: vitebsk-fil.by

• **ДЗЯРЖАЎНЫ КАМЕРНЫ АРКЕСТР РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** — вечар класічнай музыкі ў межах **XXXIV МІЖНАРОДНАГА МУЗЫЧНАГА ФЕСТЫВАЛЮ ІМЯ І. І. САЛЯРЦІНСКАГА (6+). 12 снежня ў 19.00.**
• **"ЗІМНІ ВЕЧАР З «МЯЦЕЛІЦАЙ»"** — канцэрт Дзяржаўнага аркестра рускіх народных інструментаў **"МЯЦЕЛІЦА"** (Расія) у межах **XXXIV МІЖНАРОДНАГА МУЗЫЧНАГА ФЕСТЫВАЛЮ ІМЯ І. І. САЛЯРЦІНСКАГА (6+). 13 снежня ў 19.00.**
• Новая імпрэза ў межах цыкла лекцый-канцэртаў **AD LIBITUM**, прысвечаная **ФРЭНКУ СІНАТРУ (6+). 14 снежня ў 19.00.**
• Прэм'ера. Прадстаўленне **"БРАТКА ЛІС І БРАТКА ТРУС" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ". 16 снежня ў 11.00.**
• Музычныя сустрэчы для будучых мам **"САТКАЦЬ ДУШУ З НОТ"** — 11 гадоў праекту! Сустрэча чацвёртая: **"ЗІМОВЫ НАКЦЮРН" (0+). 16 снежня ў 16.00.**
• Да Года міру і стварэння — прадстаўленне **"ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ". 17 снежня ў 11.00.**
• Закрыццё **XXXIV МІЖНАРОДНАГА МУЗЫЧНАГА ФЕСТЫВАЛЮ ІМЯ І. І. САЛЯРЦІНСКАГА — КАЛІНІНГРАДСКІ СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР (6+). 17 снежня ў 18.00.**

УНП 300149385

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі.
• Навагодняя інтэрактыўная праграма **"Аперацыя «Выратуем Новы год»"** — захапляльны квэст для дзяцей. Яны адправяцца ў займальнае падарожжа, каб выратаваць самае чароўнае свята! Праграма адбудзецца **26, 29, 30 снежня** і **3, 5, 6 студзеня**. Узрост удзельнікаў — ад 5 да 10 гадоў. Кошт уваходнага білета на праграму для дзіцяці (з правам наведвання экспазіцыі) — 15 руб., для аднаго суправаджальніка квіток бясплатны. **Абавязковыя папярэдні запіс і набыццё білетаў у касах музея да 15 снежня.**
• Падчас навагодніх канікул у зале **"Музей для дзяцей"** юным наведвальнікам прапануюць майстар-класы па вырабе навагодняй паштоўкі, сняжынак, па роспісе цацак, а таксама па гісторыі радыё і азбукі Морзэ. **Прастора працуе з серады па нядзелю!**
• **14 снежня ў 15.00** адкрыецца выстава ёлачных рэтраўпрыгожанняў **"Гісторыя ў навагодніх цацках"** з прыватнай калекцыі Наталлі Анатольеўны Кавалёвай. У гэтай экспазіцыі вы зможаце ўбачыць і ацаніць непаўторныя шкляныя шары, ватныя і падставачныя фігуры, чароўных калядных анёлаў і казачных герояў ручной работы. Акрамя таго, будуць прадстаўлены ўпрыгажэнні часоў Вялікай Айчыннай вайны.
• Квэсты — гэта ўнікальнае пазнавальнае і захапляльнае падарожжа па музейных залах для арганізаваных груп наведвальнікаў (да 20 чалавек).
Усяго прапануецца тры квэсты:
— **"Шлях да Перамогі"** для ўдзельнікаў ад 12 гадоў,
— **"Сумка з чырвоным крыжам"** для ўдзельнікаў ад 14 гадоў,
— **"Франтавы дзённік"** для ўдзельнікаў да 12 гадоў.

Падрабязнасці на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **"Падарожжы Фёдара Конюхава". Да 28 студзеня 2024 года.**
• Курс **"Арт-азбука ў НЦСМ" (8+). Да 31 мая 2024 года.** Кожная сустрэча складаецца з тэарэтычнай часткі і творчых заняткаў. Яны праходзяць у інтэрактыўнай форме, удзельнікаў чакаюць практычныя заданні, майстар-класы, квэсты і гутаркі з мастакамі. Праграма курса пабудавана на работах, якія захоўваюцца ў фондзе ўстановы, сучасных беларускіх аўтараў. Працягласць аднаго занятку — 2 гадзіны. Колькасць удзельнікаў у групе — 10–12 чалавек. Перыядычнасць заняткаў — 2 разы на месяц па суботах. Кошт аднаго занятку — 15 рублёў. Абавязковая папярэдняя рэгістрацыя!

Дадатковая інфармацыя і запіс на курс па тэл.: 8 017 2350331, 8 017 3629336 (9.00–17.00).

УНП 192543414

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАУРЫШ.

Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактар літаратурны — Мацвей ЗАЙЦАЎ.
Рэдактар мастацкі — Мікалай КАСЦЮКОЎ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Льготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 07.12.2023 у 16.00. Замова № 2844. Наклад 3318.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2023.